Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 479. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтовага тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя ад 50 проц. дарожай. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. залогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок 35 к. За кожны радок 15 „ Беспляцныя і пераважнымі за тэкстам 15 „ За кожны радок 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх чыг.-гал. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 29 (2513) Чацьвер, 7-га лютага 1929 г.

Падыхтоўка новае правакацыі на Усходня-Кітайскай чыгунцы.

Англа французкі імпэрыялізм штурхае мукдэнцаў на захоп чыгункі.

ШАНХАЙ, 1-2. Ангельскі орган «Порт Чайна Дэйлі Ньюс» агалошвае сэрыю артыкулаў вядомага рэакцыянэра і ворага кітайскага нацыянальна-вызваленчага руху, журналіста Гільбарта, накіраваных проці Усходня-Кітайскае чыгункі. Артыкулы з правакацыйнымі пераблітваньнямі апавядаюць пра гісторыю пабудовы і заяўляюць, што кітайцы наўхільна павінны паспрабаваць у даны момант заўладаць чыгункаю. Гета, на думку Гільбарта выклікае ўскладненьні ва ўсей Манчжурыі і прыводзе да таго, што чыгункаю заўладае «нехта трэці».

Адначасна з кампаніяй газэты, у мясцовых французкіх колах распаўсюджаліся чуткі, нібыта частка французкіх акцыянэраў ліквідаванага Расейска-Азіяцкага банку (які быў намінальна ўладаром чыгункі) хоча аснаваць новы банк пад назваю „Банк Азіятык", які здолеў бы выступаць законным прэтэндэнтам на Усходня-Кітайскую чыгунку.

* *

ШАНХАЙ, 4-2. Кампанія ангельскага органу «Порт Чайна Дэйлі Ньюс» проці Усходня-Кітайскае чыгункі падхоплена французкаю газэтаю «Журналь дэ Шанхай». У артыкулах газэта «даводзіць» што Камінтэрн абаснаваў у ранейшай нейтральнай палосе Усходня-Кітайскае чыгункі «усе свае сакцыі, якія дзейнічаюць цяпер там пад рознымі назвамі, як „Шляхкон" «Мясіком», «Жанадзэл», спартыўныя і культурныя арганізацыі і г. д.

Газэта заявае, нібыта мукдэнская ўлада намерана захапіць чыгунку і даводзіць законнасьць і абаснаванасьць такіх намераў. Газэта раіць Чжан Сюэ-Ляну і Нанкіну сьцерагчыся з рэалізацыяй гэтых планаў, заклікаючы, нібыта бальшавікі згуртоўваюць войска на межах Манчжурыі.

Англа-амэрыканскі канфлікт зацягваецца.

ЛЁНДАН, 2-II. У палаце во шчын міністру замежных спраў Чэмберлену было заладзена запытаньне аб адносінах ангельскага ўраду да перападпісаньня арбітражнага ўгавору між Англіяй і Злучанымі Штатамі. Сябра рабочае партыі Рэні Сьмыт, які высунуў гэтае запытаньне, адзначыў, што праэкт пагавора ўгавору быў пасланы ўрадам Злучаных Штатаў ангельскаму ўраду больш году назад, але ангельскі ўрад да гэтага часу ня даў ніякага адказу.

Чэмберлен адказаў, што ангельскі ўрад чакае адказу ад дамініёнаў наконт праэкту ўгавору. У сучасны момант, сказаў Чэмберлен, ангельскі ўрад „уважліва вывучае" меркаваньні, паданьні дамініёнамі, а таксама матэрыялы, сабраныя ангельскім міністэрствам замежных спраў.

У палітычных колах зазначаюць, што, калі грунтавацца на адказе Чэмберлена, дык ангельскі ўрад намерен, як і раней, адцягваць падпісаньне ўгавору.

ІНТРЫГІ АМЭРЫКІ Ў АНГЕЛЬСКІХ ДАМІНІЁНАХ.

ЛЁНДАН, 30-I. Зараз жа за дамініёнамі Канада і Ірляндыя, якія маюць ужо сваіх дыпляматычных прадстаўнікоў у Вашынгтоне, цяпер і трэці ангельскі дамініён—Паўднёва-Афрыканскі саюз—распачаў перамовы з урадам Злучаных Штатаў аб назначэньні свайго пасланьніка.

АМЭРЫКА БУДУЕ НОВЫЯ КРЭЙСЭРЫ.

ВАШЫНГТОН, 5-2. Сэнат Злучаных Штатаў адобрыў законапраэкт, які прадугледжвае пабудову 15-ці крэйсэраў і 1-го авіяносца.

ФРАНЦЫЯ ЎМАЦОЎВАЕ ЎЗБРОЕНЬНІ Ў ІНДАКІТАІ

ПАРЫЖ, 5-2. Водлуг паведамленьняў друку, французкая ўлада ў Індакітаі ўжывае належныя захады дзеля абароны гэтае калёніі на выпадак, калі на Далёкім Усходзе выбухне канфлікт, у які будзе ўцягнута Францыя. Будзе пабудавана флётылія падводных лодак, а таксама пасыльныя судны спэцыяльнага тыпу, узброеныя 14-цісантымэтравымі гарматамі і з гідрасамалётамі на борце.

ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У НЯМЕЧЧЫНЕ.

ПЕРАМОВЫ АБ РЭКАНСТРУКЦЫІ ЦЯПЕРАШНЯГА ЎРАДУ.

БЭРЛІН, 5-II. Пры перамовах аб афармленьні сучаснае ўраставае каліцыі ў рэйхставе народная партыя высоўвае абавязковыя патрабаваньні перабудаваць таксама і ўрадавую каліцыю ў Прусіі праз далучэньне да яе народнае партыі. Паколькі ніводная з партый каліцыі ня схільна ахвяроўваць міністэрскую пасаду, дык у палітычных колах лічаць, што перамовы будуць зацяжнымі і цяжкімі.

ДЛЯ РЭАКЦЫЯНЭРАЎ НЕПАЖАДАНА АДСТАЎКА ЎРАДУ МЮЛЬЛЕРА.

БЭРЛІН, 5-II. Водлуг паведамленьняў друку, прэзыдэнт Гіндэнбург заявіў, што, на яго думку, адстаўка сучаснага ўраду была-б зараз вельмі непажаданаю водлуг прычын як унутранае, так і замежнае палітыкі.

У мяншавіцкім лягеры няма адзінасьці.

БЭРЛІН, 5-2. Даныя аб апругавай сацыял-дэмакратычнай канфэрэнцыі ў Бэрліне, агалошаныя «Ротэ Фанэ» паказваюць, што на канфэрэнцыі выявіліся значныя разыходзіны між лідэрамі сацыял-дэмакратычнае партыі і меншавікамі; разам з тым заўважана і збліжэньне між лідэрамі правага і «левага» крыла. Дэлегаты вострa выступалі проці старшыні сацыял-дэмакратычнае партыі, рэйхсканцлера Германа Мюльлера і вапрамку газэты «Форвэрт».

БУНТ ПРОЦІ БЫЛЫХ ЭКСПЛЁАТАТАРАЎ.

ЛЁНДАН, 5-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Колёмбо (Цэйлён): „Бастуючыя трамвайныя рабочыя згадзіліся з адміністрацыяй спыніць забастоўку на 12 дзён. Аднак, узрушэньне сярод рабочых не супакоілася. Забаставала 15 тысяч рабочых партовых чыгунак; большасьць рабочых ня хоча вярнуцца на працу. Увечары здарыўся наскок на паліцэйскую ўправу, якая была пазакідана каменьнямі. Абараняючыся, паліцыя параніла некалькі асоб. 10 паліцэйскіх паранена. Становішча пагражаючае. Паліцыі выдадзена дадатковая зброя.

СТЫЧКІ Ў БАМБЕІ.

ЛЁНДАН, 5-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «У Бамбеі здарылася новая стычка між аданамі (індусы аўганскага паходжаньня, якія выкарыстоўваюцца ў якасьці штрэйхбрэхераў на тэкстыльных фабрыках) і індусамі, рабочымі тэкстыльных фабрык. У выніку стычкі забіта 6 чалавек, пераважна індусаў. Разам-жа да гэтага часу ў выніку стычак забіта 13 адаваў, 5 індусаў, 1 паліцэйскі афіцэр, і 104 асобы паранена».

ПРОЦІ ГУЛЬТАЕУ-ТЫРАНАЎ.

БУРНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ-СХОД РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЁКУ Ў БУХАРЭСЬЦЕ.

ВЕНА, 5-II. Румынскія газэты паведамляюць, што 3 лютага ў Бухарэсьце адбыўся масавы сход, скліканы рабоча сялянскім блёкам. Сход зьявіўся дэманстрацыяй проці пагрозы імпэрыялістычнае вайны, за мірны ўгавор з СССР і за ўсеагульную амністыю ў Румыніі. Дэманстранты зьнішчылі павешаныя ў залі пасяджэньняў партрэты прадстаўнікоў румынскае дынастыі і рэгенцтва пры сьпевах „Інтэрнацыяналу" і выгуках—«Нам непатрэбны бязьдзельнікі». Пры спробе дэманстрантаў наладзіць працэсію, яны былі абкружаны паліцыяй, якая арыштавала блізка 200 чал. і павяла іх у прэфэктуру, дзе яны былі вызвалены. Проці некаторых асоб распачата дазнаньне.

У Індыі бастуе 150.000 чалавек.

ВЫБУХНУЛІ НЕПАКОІ.

ЛЁНДАН, 4-2. У Бамбейскай акрузе, дзе ўжо 2 месяцы бастуюць рабочыя нафтавікі, выбухнулі непакоі. У стычках з рабочымі пацярпела больш 60-ці чалавек з фабрычнае варты. 11 асоб намерла. Думаюць, што агульны лік бастуючых дасягае 150-ці тысяч чалавек, з якіх 60 проц. тэкстыльных рабочых, рабочых майстэрняў Вялікае Індускае Бародзкае чыгункі, а таксама нафтавікоў.

Клясавы і нацыянальны ўціск у Польшчы

У ІМЯ ІНТАРЭСАЎ МІЖНАРОДНАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

Фашысцкі ўрад абяцае і ў далейшым сустракаць штыкамі і астрогамі кожнае выступленьне рабочае клясы.

ПРАМОВА Т. БІТНЭРА Ў СОЙМЕ.

ВАРШАВА, 5-II. У спрэчках аб бюджэце міністэрства ўнутраных спраў у сойме выступіў камуністычны дэпутат Бітнэр. Прамоўца сказаў «Мы ведаем, што лёзунг незалежнасьці Польшчы мае клясавае значэньне. Уласьніцкія клясы бачаць у лёзунгу незалежнасьці Польшчы зброю для забясьпекі свайго багацьця, сваіх клясавых інтарэсаў. Уласьніцкія клясы фактычна ліквідуюць незалежнасьць Польшчы. Шмат буйных прамысловых прадпрыемстваў перайшло ў рукі чужаземнага капіталу. У польскім дзяржаўным банку сядзіць дыктатар-кантралёр амэрыканскага капіталу. У генэральным штабе сядзяць французкія афіцэры. Сурёзнаю небясьпекаю для незалежнасьці Польшчы зьяўляюцца падпісаньні польскім урадам угаворы і ваенныя згоды, бо яны падначальваюць Польшчу інтарэсам міжнароднага імпэрыялізму, які падрыхтоўвае вайну проці СССР. Міністр хоча давесьці, што барацьба проці камуністаў раўназначна барацьбе за інтарэсы чалавецтва і прагрэсу. У імя гэтага прагрэсу тысячы польскіх рабочых і сялян пакутуюць у астрогах; у імя гэтае чалавечнасьці паліцыя зьбівае і забівае арыштаваных рабочых. 15-га студзеня ў Сасновіцах у паліцэйскім вучастку быў забіты рабочы Пляк, адзінае зачынства якога было ў тым, што яго западозрылі ў прыхільнасьці да камунізму».

У гэтым месцы Складкоўскі перапыняе Бітнэра выгукам: „Паліцыя страляла і будзе страляць ва ўсіх камуністаў, якія будуць змагацца проці адзінства дзяржавы".

Бітнэр адказвае з трыбуны: «Зараз польскія рабочыя яшчэ раз пачулі з вуснаў самога міністра тую праўду, што калі яны выступаюць на абарону сваіх правоў, дык іх сустракаюць штыкамі і кулямі. З гэтае прычыны яны павінны змагацца з такім ражымам не на жыцьцё, а на сьмерць».

Спыняючыся на здрадніцкай палітыцы ППС у адносінах да пралетарыяту Заходняе Беларусі і Заходняе Украіны. Бітнэр двойчы ўжывае выраз «ЗАВАЯВАНЫЯ НАРОДНАСЬЦІ». Абодвы разы старшыня зьклікае яго да парадку.

З адказам на ўсе прамовы ў спрэчках выступае Складкоўскі. Ён спрачаецца з фінансавай камісіяй сойму, якая адмовілася зацьвердзіць сакрэтны фонд міністэрства ўнутраных спраў «Дзевяць дзесятых сакрэтнага фонду міністэрства ўнутраных спраў,—кажа Складкоўскі,—выдаецца на барацьбу з элементамі, якія імкнуцца зьнішчыць сучасны лад. Грошы, якія трацяць на гэтую працу чужаземныя варожыя Польшчы фактары, у шмат разоў перавышаюць сакрэтны фонд міністэрства ўнутраных спраў». Складкоўскі распаўсюджваецца аб нейкіх фантастычных грашох, якія нібыта атрымліваюць польскія камуністы ад чужаземнае дзяржавы і якія трацяцца на камуністычную прапаганду.

„ПАЛІЦЫЯ І ШТЫКІ НА ЗЬМЕНУ ІДЭІ ФЭДЭРАЦЫІ".

ВАРШАВА, 5-2. Выступаўшы сёньня дэпутат сялянскага саюзу Домбскі між іншым заявіў што нацыянальнае пытаньне ў Польшчы ў сучасны момант на было такую вострасьць, як ніколі. Кажучы аб крэсах Польшчы, прамоўца зазначае: «Ідэю фэдэрацыі і вуніі нам замяняе цяпер паліцыя і штыкі».

Выпад дэпутата-пілсудчыка проці ўкраінцаў.

ВАРШАВА, 6-2. Сёньня выступіў з прамовай дэпутат беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам Яруцельскі.

Ад першага дню існаваньня сойму,—зазначыў прамоўца,—мы цярпім правакацыйныя выступленьні украінскіх дэпутатаў. Бубак нашае цярплівасьці перапоўніўся. Вы,—кажа прамоўца, зварочаліся да украінскіх дэпутатаў—тарарызавалі палякаў, вы катавалі іх. Мы просім міністра ўнутраных спраў узяць пад сваю абарону мірнае польскае жыхарства, якое пракакуецца украінцамі».

ВАРШАВА, 5-2. Афіцыёзная «Эпока» з абобраньнем піша пра выступленьне дэпутата беспартыйнага блёку Яруцельскага на учарайшыя прамовы украінскіх дэпутатаў. Газэта вітае Яруцельскага, які нарэшце кінуў словы праўды ў адказ на грубасьці украінскіх дэпутатаў па адрэсу Польшчы».

10-годзьдзе польскага парляманцтарызму.

Сьвяткаваньне дзесятых угодкаў польскага парляманцтарызму адкладаецца на 23 лютага г. г. з тэй прычыны, што прэзыдэнт знаходзіцца цяпер у Закапаным і зможа быць прысутным на сьвяткаваньні толькі ў адзначаны тэрмін.

Забастоўка ў фабрыках абутку.

У Быдгоскіх фабрыках абутку выбухла забастоўка. Прычынай забастоўкі зьяўляецца нізкая заработная плата.

Польска-савецкая чыгуначная канфэрэнцыя.

«Пшэдсьвіт» (№ 33) паведамляе, што ў першай палове лютага ў Радашковічах адбудзецца польска-савецкая чыгуначная канфэрэнцыя, прысьвечаная галоўным чынам гранічнай камунікацыі.

Палітычнае забойства ва Улацлаўску.

«Наш Пшэгляд» паведамляе, што ва Улацлаўску (Польшча) здарылася забойства на ўсім адзначаным на палітычным грунце. Забітым аказаўся нейкі Язэп Вайцяхоўскі. Стралаўшыя ў яго асобы пры гэтым крычалі «згінь, здраднік». Стралаўшыя не затрыманы.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Арышт 20 сялян.

У Радашкоўскім лесе пад Стоўбцам (Усх. Галіцыя) паліцыя арыштавала аднаго селяніна. Натоўп сялян у ліку каля 80 чалавек напаў на паліцыю і адбіў арыштаванага. Пасьля гэтага з Стоўбцаў выехалі амы былі значныя сілы паліцыі. 20 сялян арыштавана.

12 засуджаных.

У Баластоку акруговы суд прыгаварыў 12 маладых асоб з Саколкі ў астрог на тэрміны ад 2 да 6 гадоў за прыналежнасьць да кампартыі.

Напад на в. Канюхі.

«Слово» (№ 18) паведамляе, што 20 студзеня, калі поўначы на вёску Канюхі, Беняконьскай вол., зроблен быў напад 11 узброеных у карабіны і рэвальвэры бандытаў, пры гэтым адзін жыхар в. Канюхі Т. Бандарэвіч быў забіты, дзьве асобы ціжка паранены і адна—лёгка.

6 бандытаў злоўлены, рэшта ўцяклі ў лясы.

Спыненьне судовай расправы над белхадэкамі.

На мопы амністыі спынена справа членаў беларускай хрысьц. дэмакратыі М. Голаса, В. Чаплінскага і П. Пашкевіча, якія ў часе выбараў да сойму вялі агітацыю ў Ашмянскім павеце і былі пацягнуты да адказнасьці на аснове 129 артыкулу К. К.

Рэпрэсіі проці „Бел. Крыніцы".

„Бел. Крыніца» (№ 5) паведамляе, што 28 студзеня суловы сьледавацель II раёну г. Вільні дакладаў да сябе рэдактара „Бел. Крыніцы» Позьняка і заявіў яму, што ён абвінавачваецца па 129 арт. К. К. за зьмяшчэньне ў № 56 «Б. К.» артыкул пад назвай: „Выезд з Прагі п. Шадзівага".

Сьледавацель забараніў Позьняку выезд з Вільні.

Будова помніка Басановіча.

«Кур'ер Віл.» (№ 22) паведамляе, што праца на пабудове помніка на магіле вядомага літоўскага дзеяча д-ра Басановіча прыходзіць к канцу. Учыстае адчыненьне помніка наступіць 16 лютага г. г.

Пажар ў маёнтку.

Нядаўна ў маёнтку Бенкус, Галышанскай вол., Ашмянскага пав. выбух пажар. Агонь спаліў будынак, у якім жылі парабкі і іх сем'. Згарэла таксама каля 200 пудоў ільнянога насеньня і ільну, а таксама машына для ачысткі ільну. Страты раўняюцца 33 тысячам злотых.

„Саха".

Вышаў у Вільні першы нумар за 1929 г. беларускай гаспадарчай часопісі «Саха».

ФРАНЦУСКІЯ ТРАЦКІСТЫ—ПАДГАЛОСКІ РЭАКЦЫІ

ДЭМАНСТРАЦЫЙНАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПРОЦІ КАНДЫДАТУРЫ Т. МАРТЫ.

ПАРЫЖ, 4-II. На выбарах у Пюто трацкісцкая група «Марке-Ленін» высунула свайго кандыдата Кудаля. Не зважаючы на ўзмоцненую агітацыю друку і спробу проціпаставіць гэтага кандыдата Марты завяраньнем, што Кудаль быў радавым матросам і ўдзельнікам чорнаморскага паўстаньня, Кудаль сабраў толькі 230 галасоў.

Адначасна другая трацкісцкая група „проці плыні" выпусьціла адозву з антыбальшавіцкімі выпадамі; адозва раіла падтрымаць Марты пад лёзунгамі—„за камунізм, проці тэрмідору". Плякаты кампартыі зварачалі ўвагу рабочых на шчыльную сувязь трацкісцкага кандыдата з рэакцыйнымі элементамі, якія спрабавалі трацкісцкай дынэрсіяй заблытаць у апошнюю хвіліну рабочых выбаршчыкаў.

Французкай кампартыі ке па дарозе з прыхвасьнямі буржуазеі.

ПАРЫЖ, 4-2. Група Фросара (так званы „сацыялістычна-камуністычны саюз") прапануе кампартыі высунуць на надыходзячых муніцыпальных выбарах агульнае з сацыялістамі в барчыя сьпісы. У адказ на гэта палітбюро французкае кампартыі, захоўваючы лёзунг „АДЗІНЫ ФРОНТ—КЛЯСА ПРОЦІ КЛЯСЫ", агаласіла заяву, у якой зазначана: «Кампартыя разглядае прапанову сацыялістаў аб адзіным выбарчым сьпісе, як нашчыры манэўр людзей, якія бачаць, што рэвалюцыйныя рабочыя пакідаюць шэрагі сацыялістычных арганізацый. Кампартыя гатова выступіць на выбарах рука ў руку з усімі сацыялістычнымі і беспартыйнымі рабочымі, якія лічаць адзіны фронт пастаяннай арганізацыяй на месцах сваёй працы. Што-ж датычыць палітычнага адзінства, дык яно можа быць ажыцьцёўлена толькі ў барацьбе проці ўсіх партый буржуазіі пад кіраўніцтвам кампартыі—адзінае партыі пралетарыяту».

Пуанкарэ „расчараваў" меншавікоў.

ПАРЫЖ, 2-II. Заява Пуанкарэ аб патрабе захаваць клерыкальныя парадкі ў Эльзасе не апраўдала надзей радыкалаў і сацыялістаў, якія спадзяваліся, што Пуанкарэ зойме ў пытаньні аб Эльзасе больш прыхільную для іх пазіцыю. Яны спадзяваліся, што такая пазіцыя дасьць ім падставу для новых перамоў «аб рэарганізацыі ўрада ўлева». Агульны палітычны вывад з выступленьня Пуанкарэ па пытаньні аб Эльзасе зроблен сацыялістычнай партыяй у органе „Суар", які піша: „урад спрабаваў здаволіць на словах, але на справе яшчэ раз саступіў перад нажымам правых, пераняўшы у асноўным іх палітыку ў адносінах да Эльзасу".

НОВЫ МЫТНЫ ТАРЫФ У КІТАІ.

ШАНХАЙ, 2-II. З учарайшага дню ва ўсіх кітайскіх партах набыў правамоцнасьць новы мытны тарыф. Новыя тарыфы зьяўляюцца вынікам кампрамісу між патрабаваньнем мытнае аўтаноміі і дамаганьнямі дзяржаў. Тарыфы маюць моц на адзін год, пасьля чаго Нанкін прапануе ўвесьці поўную мытную аўтаномію.

Карыстаньне новым тарыфам на куль-што ня выклікала ніякіх непаразуменьняў.

ЧУЖАЗЕМЦЫ ПАКІДАЮЦЬ КАБУЛ.

ЛЁНДАН, 5-II. Учора з Кабулу на ангельскіх самалётах было вывезена яшчэ 23 эўрапейцы і індусы.

СЫН АМАНУЛЫ ЗАСТАЕЦЦА Ў БЭРЛІНЕ.

БЭРЛІН, 4-II. Водлуг атрыманых карэспандэнтам ТАСС вестак, сын аўганскага надышаха Аманулы Хадаятула, які знаходзіцца зараз у Бэрліне, затрымаецца тут на некаторы час. Пытаньне аб яго падарожжы ў Маскву і далей на Усход канчаткова ня вырашана.

Польскія качкі аб перавароце ў Літве.

Віленскае «Слово» (№ 28) паведамляе, што супрацоўніку рыскага „Сегодня" удалося беспасрэдна перагаварыць па тэлефону з Вальдэмарасам, наконт паведамленьняў замежнай і асабліва польскай прэсы аб перавароце ў Коўні. Вальдэмарас сьцьвердзіў, што прычынай выхаду ў адстаўку палк. Плехавічыуса зьяўляецца яго нездароўе, што ніякіх арыштаў афіцэраў у Коўні ня было. «Усе пагалоскі аб арышце,—сказаў Вальдэмарас,—зьяўляюцца звычайнай выдумкай. Агульнае становішча ў Літве зусім спакойна і ня здарылася нічога, што-б магло выклікаць іх».

Паход на каапэратывы ў Югаславіі.

ВЕНА, 5-2. З Белграду паведамляюць, што кангрэс сэрбскіх гандлёвых палат, які адбыўся гэтымі днямі, ухвалёў рэзалюцыю з патрабаваньнем роспуску ўсіх спажывецкіх каапэратываў.

СЁНЬНЯ МАЕ БЫЦЬ ПАДПІСАН НАШ МІРНЫ ПРАТАКОЛ.

У МАСКВУ ДЛЯ ПАДПІСАНЬНЯ ЕДЗЕ РУМЫНСКІ ПАСОЛ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 5-2. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Румынскі пасланьнік у Варшаве Давіла ўпаўнаважан румынскаю рэгенцкаю радаю падпісаць у Маскве пратакол Літвінава. Давіла выязджае з Варшавы 6-га лютага разам з першым сакратаром румынскага пасольства ў Варшаве Давідэску і дарадчыкам польскага пасольства ў Бухарэсьце Набылянскім. У суботу Давіла выедзе назад у Варшаву».

Грамадзкасьць Эстоніі абурана паводзінамі польшчы.

РЭВЕЛЬ, 5-II. „Рэвалер Ботэ", абмяркоўваючы заяву Патэка аб пазіцыі Эстоніі і Латвіі ў пытаньні аб падпісаньні прапанаванага СССР пратаколу, востра выступае проці „дамаганьня Польшчы гаварыць ад імя гэтых дзяржаў".

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ПАТ ДЛЯ АНГЕЛЬСКАЕ ПРЭСЫ.

ЛЁНДАН, 5-II. У зьвязку са зьмешчаным у «Тайнсе» паведамленьнем з Масквы аб пазіцыі Латвіі і Эстоніі ў пытаньні аб падпісаньні прапанаванага СССР пратаколу, польскае тэлеграфнае агенцтва прыслала ў газэту такую тэлеграму: «Паведамленьне аб тым, што Латвія і Эстонія не ўпаўнаважалі Польшчу праводзіць ад іх імя перамовы з саветамі аб падпісаньні літвінаўскага пратаколу, зьяўляецца няправільным».

Сакрэтная нарада ў румынскага прэм'ера.

ВЕНА, 5-II. Водлуг паведамленьня з Бухарэсту, гатымі днямі адбылася скліканая прэм'ерам Маніу сакратная нарада кіруючых дзеячоў урадавае нацыянальна-сялянскае партыі, каб абмеркаваць „апошнія даныя ў пытаньні пакоп падпісаньня маскоўскага пратаколу". Нарада ўхвалі а «на вельмі паказваць, што Румынія здаволена савецкаю прапановаю надаць правамоцнасьць пакту Белёга».

У Саюзе ССР.

На выбарчым фронце.

ПРОЦАНТ ПАРТЫЙЦАЎ І ЖАНЧЫН У САВЕТАХ УЗРОС.

МАСКВА, 5-2. Водлуг вестак, прысланых ва ўсерасейскую цэнтральную выбарчую камісію, выявілася, што з 618392 чалавек, якія маюць права абіраць у гарсаветы, на выбары зьявілася 410922 чалавекі, або 66,4 проц. У склад новаабраных гарсаветаў увайшло 24,6 проц. жанчын. Камуністы і камсамольцы.

ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАЎ СЕЛЬСАВЕТАЎ НА УКРАІНЕ.

ХАРКАЎ, 5-2. Цэнтральная статыстычная ўправа атрымала з округаў тэлеграфныя паведамленьні аб ходзе выбарчае кампаніі. Агульны лік перааабраных на Украіне сельсаветаў дасягае 4 497. Б ізка 40 проц. сельсаветаў Украіны ўжо поўнасьцю абнавіла свой склад. У сярэдніх на пераабраных сельсаветах на выбары зьявілася 64,2 проц. усіх асоб, згодна выбарчых сьпісаў. У новых сельсаветах жанчыны складаюць 16,6 проц., партыйцы 10,5 проц., камсамольцы 6,2 проц. і сябры камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі 46,3 проц.

Рэформа падрыхтоўкі рабочае сілы для прамысловасьці.

Пастанова прэзыдыуму УЦСПС.

МАСКВА. Прэзыдыум УЦСПС ухваліў пастанову па пытаньні аб рэформе падрыхтоўкі рабочае сілы для прамысловасьці. ШКОЛА ФАБЗАВУЧУ павінна рыхтаваць кваліфікаваных і высокакваліфікаваных рабочых такіх прафэсій, якія патрабуюць доўгага вытворчага і тэарэтычнага навучаньня; БРЫГАДНАЕ ВУЧНЁЎСТВА мае на мэце падрыхтаваць рабочых такое кваліфікацыі, якая не патрабуе доўгае вытворчае навучкі; ГАЛОЎТЭХНІЧНЫЯ КУРСЫ пры прадпрыемствах заснаўваюцца для падвышэньня кваліфікацыі рабочых, занятых у вытворчасьці і для падрыхтоўкі рабочых новае кваліфікацыі, а КУРСЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА ІНСТЫТУТУ ПРАЦЫ рыхтуюць рабочую сілу згодна заданьню НК Працы, ВСНГ і асобных галіндарных арганізацый. Усе брыгады падлягаюць абавязковаму навучаньню бліжэйшаму арганізаванай формамі навучаньня.

З прычыны таго, што задачы падрыхтоўкі рабочае сілы непадзяльна зьвязаны з агульнымі гаспадарчымі задачамі краю, дык трэба ўсю сорэзну навучаньня, навучаньня і ажыцьцяўнага кіраваньня рабочай адучацыяй перадаць ВСНГ і адпаведным гаспадарчым органам, пазбаўляючы за органамі НК Асьветы функцыі агульнага кантролю за пастаноўкаю вучэбна-метадычнае і грамадзка-выхаваўчае працы.

ДА ВЫБАРАЎ ВА ЎСЕСАЮЗНУЮ АКАДЭМІЮ НАВУК.

СНК СССР ЗДАВОЛІЎ ХАДАЙНІЦТВА ПРЭЗЫДЫУМУ АКАДЭМІІ АБ ПЕРАБАЛЁТЫРОЎЦЫ КАНДЫДАТУР ДЭБОРЫНА, ФРЫЧЭ І ЛУКІНА.

МАСКВА, 6-2. Прэзыдыум Акадэміі Навук на пасяджэньні 12-га студзеня, пасьля выбараў новых акадэмікаў, хваліў увайсьці праз чарговы агульны сход у СНК СССР з хадайніцтвам аб тым, каб кандыдатуры забалётыраваных агульным сходам, але абраных у адзяленьні таварышоў Дэборына, Фрычэ і Лукіна, прапанаваць агульнаму сходу ў новым складзе Акадэміі, не паўтараючы ўсю працэдуры выбараў.

Экстраардынарны агульны сход акадэмікаў 17-га студзеня ўпаўнаважыў прэзыдыум Акадэміі Навук зьвярнуцца перад СНК СССР хадайніцтва аб перабалётыраўцы. На падставе пастановы агульнага сходу прэзыдыум Акадэміі Навук зьвярнуўся да СНК СССР з адпаведнаю заявай. На пасяджэньні 5-га лютага СНК СССР, разглядзеўшы хадайніцтва Акадэміі Навук, ухваліў зацьвердзіць яго.

Паўміліярда рублёў на крэдытаваньне сельскае гасп.

МАСКВА. Наркамфін СССР зацьвердзіў плян крэдытаваньня сельскае гаспадаркі на 1928-29 г. Згодна гэтага плану, сума вытворчых крэдытаў на сельскую гаспадарку складзе па Цэнтральным Сельска-Гаспадарчым Банку 270,4 міліёнаў рублёў і па рэспубліканскіх банках—233 міліёны рублёў.

Цікавы і каштоўны вопыт.

АБ'ЯДНАНЬНЕ АСОБНЫХ КАЛГАСАЎ У КАМБІНАТЫ.

ХАРКАЎ, 5-II. «Украінскае калгасаб'яднаньне» распачало цікавы вопыт аб'яднаньня асобных калгасаў у адну магутную гаспадарку. У Сахноўскім раёне, Палтаўскае акругі, з чатырох с.-г. хаўрусаў летась у кастрычніку быў заснаваны «Сахноўскі камбінат сельска-гаспадарчых хаўрусаў імя 15-га зьезду УсеКП(б)». Кожны хаўрус, які ўвайшоў у камбінат, спэцыялізаваўся на якой-небудзь адной галіне сельскае гаспадаркі. Такая спэцыялізацыя дала магчымасьць дасягнуць найбольшага вытворчага эфэкту. Камбінат мае ўжо значны прыбытак.

Яўрэйскі адміністрацыйны раён на Украіне.

ХАРКАЎ, 5-2. Прэзыдыум усеукраінскага ЦВК зацьвердзіў пастанову аб вылучэньні ў межах Запароскае акругі яўрэйскага нацыянальнага Новазлатапольскага раёну. З 16-ці тысяч жыхарства гэтага раёну—73 пр. яўрэі, 24 проц. украінцы і 3 проц. немцы. Украінскае і нямецкае жыхарства аднадушна выказала згоду ўвайсьці ў склад яўрэйскага раёну.

Помнік вучонаму-рэвалюцыянэру.

МАСКВА, 5-II. 4-га лютага на пляцу перад новым будынкам Сельска-Гаспадарчае Акадэміі імя Ціміразева ў Пятроўска-Разумоўскім адбылося ўрачыстае адчыненьне помніка вучонаму-рэвалюцыянэру К. А. Ціміразеву. Помнік уяўляе сабою гранітнае паўгрудзьдзе вучонага.

ГРАШОВЫЯ РАСТРАТЫ Ў КРЫМСКІМ САЮЗЕ КАМУНАЛЬНІКАЎ.

МАСКВА. З заслуханага на пасяджэньні прэзыдыуму ЦК саюзу камунальнікаў паведамленьня выявілася, што ў крымскім аддзеле саюзу камунальнікаў зусім няма кантролю над саюзнымі сродкамі. Між іншым, сродкі фондаў спэцыяльнага назначэньня траціліся на утрыманьне апарату. Выкрыта растрата саюзных грошай.

Прэзыдыум ЦК саюзу ўхваліў распусьціць праўленьне і рэвізійную камісію крымскага аддзелу саюзу камунальнікаў і склікаць дачасны зьезд для выбару гэтых органаў. Поруч з гэтым прэзыдыум ЦК саюзу просіць крымскі савет прафсаюзаў прыцягнуць вінаватых у растрате да крымінальнае адказнасьці.

XII ЗЬЕЗД КП(б)Б.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ.

(Ранішняе і вячэрняе пасяджэньні 6-га лютага)

На ранішнім пасяджэньні зьезду з вялікай справаздачай ЦК КП(б)Б выступіў першы сэкратар ЦК К( )Б тав. Гамарнік.

Пасьля дакладу т. Гамарніка зьезд заслухаў даклад т. Кроля аб рабоце рэвізійнай камісіі �цК КП(б)Б.

У спрэчках, якія разгарнуліся па дакладах на ранішнім пасяджэньні выступілі т. т. Амбражунас—(Шклоў); Зайцаў і Штэйман (гарбарня «Бальшавік») і Ігнатовіч (Віцебск).

На вячэрнім пасяджэньні ў спрэчках па дакладах т. Гамарніка і т. Кроля выступілі т. т. Станкевіч (работніца ф-кі «Дзьвіна»), Балашоў, Конюхаў, Жан—(Віцебск), Херамінскі, Агурскі (Менск), Чарнушэвіч (Віцебск).

Выступаўшыя т.т. спыняліся галоўным чынам на пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, адзначаючы неабходнасьць больш цьвёрдага разгортваньня індустрыялізацыі ўсяе народнае гаспадаркі і сельскае гаспадаркі ў прыватнасьці.

Пытаньні каапараваньня сельскае гаспадаркі, пытаньні разьвіцьця калгаснага і саўгаскага будаўніцтва таксама знайшлі свой поўны адбітак у выступленьнях прамоўцаў.

Асаблівая ўвага выступаючых была зьвернута пытаньням рабочага жыцьця, падняцьця вытворчасьці працы, і прапоўнае дысцыпліны.

Выступаўшыя заклікалі ЦК і ўвесь зьезд і далей цьвёрда стаяць на ленінскіх пазыцыях і даць рашучы адпор усім спробам адхіліць партыю ад Ленінскага шляху.

Безьлітасная барацьба з правым ухілам, з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і прыміранцтву з імі.

У канцы вячэрняга пасяджэньня пад гукі аркестру і гучныя воплескі делегатаў зьезду ў залю ўвайшлі рабочыя, чырвонаармейскія і батрацка-бядняцкія делегацыі, якія зьехаліся з усіх куткоў Савецкай Беларусі, каб вітаць свайго правадыра—XII зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

— Мы,—сказаў чырвонаармеец пагранатраду,— цьвёрда стаім на абароне вялікага сацыялістычнага будаўніцтва, і абяцаем, што калі на нас пойдзе вораг—мы дамо яму належны адпор.

Ад імя двух тысяч рабочых галоўных чугуначных майстэрняў Гомелю зьезд вітае т. Ільковіч.

— 30 год стаю я ў варштата,— сказаў т. Ільковіч,—і вось на 53 годзе свайго жыцьця я ўступіў у рады ленінскай партыі. Я не адзін, са мной у партыю ўвойдуць сотні і тысячы іншых прадстаўнікоў рабочае клясы.

Батрак Магілеўшчыны т. Гуткоўскі пры бурных воплесках падносіць зьезду пугу і ражок.—Мы дачуліся,— кажа т. Гуткоўскі,—што некаторыя ня хочуць ісьці па заветах т Леніна, дык вось гэтай пугай выгавіце іх з сваіх шэрагаў, а ў партыю заклікайце батракоў і беднякоў.

—А калі трэба будзе стаць на абарону савецкай краіны, затрубіце ў ражок, і мы ўсе як адзін, пойдзем на ваш заклік.

Многа яшчэ выступала прадстаўнікоў ад фабрык, заводаў, калгасаў і інш.

Так рабочыя і батракі, работніцы і батрачкі з трыбуны зьезду дэманстравалі сваю згуртаванасьць і адзінства з Ленінскай партыяй.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ПЕРАВЫБАРЫ ПРАХОДЗЯЦЬ З ВЯЛІКІМ ПОСЬПЕХАМ.

Бабруйск, 6-2. Перавыбарчая кампанія ў самым разгары. Ужо праведзена—24 сходы. Штодзень рабочыя дэманструюць па вуліцах з лёзунгамі, плякатамі і аркестрамі, накіроўваючыся на перавыбары. Большасьць сходаў праходзіць з 100 проц. зьўкай. Дзень перавыбараў—нерабочы дзень, прычым спаборніцтвы праходзяць не фармальна—з урачыстасьцю дый толькі, а ў цэнтры працы грунтоўныя лёзунгі партыі, у сувязі з перавыбарамі.

На ўсіх сходах ставяцца справаздачы гарсавету, якія ўвязваюць практычныя пытаньні работы савету з грунтоўнымі задачамі партыі і улады, з пытаньнямі гаспадарчага будаўніцтва.

Першыя 24 сходы сьведчаць аб узрослай палітычнай актыўнасьці працоўных. Так, нават на сходзе ўтрымандуў-харчавікоў, выказалася звыш 20 чалавек (жанчын). На фанэрным заводзе выказалася ў спрэчках 15 ч. Спрэчкі, акрамя апошкі дзейнасьці гарсавету, у грунтоўным выпячваюць недахопы работы па шэрагу галін і закранаюць шэраг больш дробных пытаньняў.

—Гарадзкі саветмала зварачваў увагі акраінам (там непрахадзімая гразь, цемень, хуліганства).

— Якасьць машчэньня вуліц дрэнная, канавы водаправодныя капалі і закапвалі па некалькі разоў, не падлічана ўсл жыллошча па 30 проц. норме, санітарнае становішча дамоў і двароў дрэннае.

— Урачы перагружаны, мала зварачваюць увагі хворым. Няма кароты хуткай дапамогі. Цеснота школьных памяшканьняў. Дрэнны зварот з спажыўцамі, чаргі ў каапэратывах патрэбна ўжыць. Лазьню пабудавалі, ня ўсё прадугледзелі. На кожным сходзе да наказу ўносіцца шмат дадаткаў.

Я. Ізакаў.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ СЫРАВІНАЮ КРАХМАЛЬНЫ ЗАВОД.

Нядаўна пушчан Талочынскі крахмальны завод, Аршанскае акругі. У зьвязку з пускам заводу былі атрыманы тэлеграмы з павіншаваньнем ад т. Чарвякова, ВСНГ Беларусі і СССР і ад начальніка Галоўмоссельпрому.

Завод гэты пабудован на руінах дражджавога заводу равейшага абшарніка Славінскага. Ён каштаваў 300 тысяч рублёў. Завод пры поўнай нагрузцы будзе перапрацоўваць 5000 пуд. бульбы ў дзень, а на сезон перапрацуе 1 мілён пудоў. Крахмал яго прызначаны і для экспарту заграніцу. Завод абсталёван па апошняму слову тэхнікі.

Нават нямецкія манцёры, якія працавалі на заводзе па ўстаноўцы машын заявілі, што і буржуазная Нямеччына ня будзе такіх вялікіх і сьветлых заводаў для рабочых, каб ім было лепш працаваць. На 20-м годзе сваёй працы ў Нямеччыне яны толькі ў СССР сустрэлі такі завод.

Галоўнае, што мы павінны пастарацца забясьпечыць крахмальны завод сыравінай, каб не сарваць намечаны план выпуску прадукцыі—крахмалу.

Талочынскі крахмальны завод зьяўляецца пачаткам для пабудовы шэрагу такіх-жа заводаў у нас на Беларусі, якія намецію Белхарчтрэст.

Хаім Зак.

ШТО БУДЗЕ БУДАВАЦЦІ НА МАЗЫРШЧЫНЕ.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Мазырскага АВК быў зацьверджан план будаўніцтва на 1929 год.

Плян будаўніцтва пабудован улічваючы становішча гарадзкога і акруговага будаўніцтва, а таксама грашовыя магчымасьці і, выходзячы з грунтоўнай устаноўкі неабходнасьці сканчэньня ў бягучым годзе распачатых пабудоў.

Па гарадзкому будаўніцтву будзе скончана пабудова 4 хпаверхавага рабочага жыльлёвага дому.

Будзе скончана пабудоўка амбуляторыі, на што патрабуецца 26500 руб. На сканчэньне прачашнай пры акруговай больніцы 12000 руб. На новае будаўніцтва патрабуецца 130000 руб., з якіх 100000 р. да пачатку работы на пабудову тэатру-клюбу і 30000 на пабудову адпаверхавага пажарнага дэпо.

Па акруговаму будаўніцтву прызнана неабходным у будаўнічым сезоне 1929 г. скончыць і давесьці да эксплёатацыйнага становішча наступныя будынкі: па больнічнаму будаўніцтву скончыць больніцу ў м. Капаткевічах, Жыткавічах, на што адпушчаецца з мясцовага бюджэту 25000 руб. Па школьнаму будаўніцтву адпушчана для сканчэньня школ 1-й ступені 33000 р., з якіх па Жыткавіцкаму 9500 руб., па Калінкавіцкаму 3500 руб., па Лельчыцкаму 7000 р., па Нараўлянскаму 3000 руб., па Пятрыкоўскаму 3000 р. і па Азарыцкаму 7000 руб. На 7-годкі адпушчаецца 65000 р.

Акрамя гэтага адпушчана на новае школьнае будаўніцтва 62000 руб., за што павінна быць пабудована 6 двухкамплектных школ і адна 4-хкамплектная.

У гэтым годзе мяркуецца пабудаваць інвалідны дом.

Я. Саф'ян.

Да чаго прыводзіць такая канкурэнцыя.

Мы добра ведаем, што лясны будаўнічы матар'ял вельмі дарагі. Прычыны? Адна—вялікі попыт на гэты матар'ял, а другая—вядбайнасьць у яго загатоўцы. Ёсьць загатоўцы: Жалязкоп, Камтрэст, Лесбел, лясьніцтва, кватэрная канпэрацыя, якія канкуруюць між сабою ў цэнах на загатоўку. Так у нас радам вырубленыя дзялянкі Лесбелу і Зеляноцкага лясьніцтва на 13 кл. ад станцыі Гарочыцы. Здавалася, абвясьціў цану і вязі на здароўе. Аж не Вовчыкі ведаюць, што адзін дасьць даражэй другога і чакаюць, і сапраўды дачакаліся.

Калінкавіцкая кантора абвясьціла, што будзе плаціць ад колькасьці кілёметраў, вяхай яны толькі возьмуць давескі ад сельсавету, калі дасьць большы лік кілёметраў, дык больш заплоцім, нам грошай ня шкода. І возчыкі далі (Зеляноцкі сельсавет са сьпісу напісаў) на 18 кілёметраў, а Лесбел плоціць на 4-5 кап. даражэй. Паслалі калоды Лесбелу на станцыю-прыстань. А лясьніцтва абурана. Фіктыўнае даведкі ня хоча браць у сваё апраўданьне, каб даражэй плаціць і матар'ял ляжыць у лесе, ня хочуць вешці сяляне за плату за 4-5 кілёметраў дзешавейшую. Адны другіх падкузьмілі.

Ці не пара зрабіць так, каб адна ўстанова расьціла, гадавала і прадавала лес, а другая толькі адна вяла роўныя лясныя загатоўкі?

В. А. Сяргейчык.

Вызваляюцца амністыраваныя зьняволеныя.

Гомель, 6-2. Згодна пастановы юбілейнае Сесіі ЦВК БССР у Гомельскай акрузе вызвалена з пад варты 178 грамадзян, якія былі асуджаны да ўсясьці месяцаў. 145 чалавекам тэрмін пакараньня ўжан запалову. Сацыяльнае становішча зьняволеных такое: сялян 130, рабочых 45 і іншых 3.

Л. Дзешкін.

СЕЛЬСКА-ГАСП. ПАДАТАК ПАСТУПАЕ ПАСЬПЯХОВА.

Барысаў, 6-2. Паступленьне с.-г. падатку праходзіць па райёну пасьпяхова. Усяго налічана па ўсяму райёну 161282 рублёў. Да гэтага часу спагнана 108937 руб. Зьнята с.-г. падатку з бяднейшага сялянства і сем'яў чырвонаармейцаў 44215 руб. Такім чынам на першае лютага выканана 94,95 проц. гадавога заданьня. Спагнаньне страхавых плацяжоў таксама праходзіць здавальняюча. З агульнай сумы 92607 руб. 13 кап., спагнана 58067 руб. 47 к.

Ня гледзячы на распараджэньні і прапановы РВК, шэраг с-с ядбайна адносьліся да гэтай працы. Напрыклад: Чэрвяніцкі, В. Стахаўскі, Карсакаўскі, Велянцкі і Бродаўскі ня прымаюць ніякіх мер да ўзысканьня с-г падатку і страхавых плацяжоў.

РВК патрэбна прыняць рашучыя меры супроць нядбайных сельсаветчыкаў і прыцягваць іх да адказнасьці, бо тэрмін узысканьня с-г падатку скончыўся яшчэ 1 студзеня.

Друкаваная газэта на чыгунцы.

Гомель, 5-2. На чыгунцы выладжена друкаваная газэта, прысьвечаная агляду працы вытворчых нарад і камісій. Першы нумар газэты выдадзен у колькасьці 4000 экземпляраў. У газэце зьмешчаны карэспандэнцыі рабочых і саюзных арганізацый аб недахопах працы вытворчых камісій. Прэзыдыум Дорпрофсожа і кіраўніцтва чыгункі вызначылі 500 рублёў для прэміраваньня лепшых вытворчых нарад і камісій. Апроч таго, будуць прэміраваны каштоўныя прапановы рабочых.

Новая сталоўка.

ПОЛАЦАК, 6-2. ЦРК адчыніў імноў абсталяваную сталоўку. Насельніцтва вельмі задаволена добрай сталоўкай, якая будзе па настаноўцы працы лепшай у горадзе.

Радыё-лётарэя.

ПОЛАЦАК, 6-2. Акруговы савет ТУР пастанавіў узьняць хадайніцтва перад адведнымі арганізацыямі аб дазволе арганізаваць акруговую грашовую радыё-лётарэю на суму 5000 руб. Каштоўнасьць білетаў будзе 25 50 кап. На выйгрышы мяркуецца адпусьціць 1000 руб. (радыёапаратура).

Атрыманыя праз лётарэю 4000 руб. пойдуць на радыёфікацыю акругі, у прыватнасьці на трансляцыонны вузел у Полацку.

Тэлефанізуем 4 сельсаветы.

Мазыр, 6-II. Па Пятрыкоўскаму райёну будзе тэлефанізаваны 4 сельсаветы.

Цэмантныя ямы для хаваньня попелу.

Мазыр, 6-2. Акрэсьбанкам адпушчаецца кредыт акраэ ў разьмеры 5000 руб. на пабудову будынкаў і цэмантных ям на прадпрыемствах, саўгасах і калгасах для хаваньня попелу.

Усім акруговым камітэтам па правядзеньні 2-хтыднёвіка ашчаднасьці.

(КАМІСІЯМ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ РЭАЛІЗАЦЫІ II-Й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ).

Упагнаньне свабодных сродкаў насельніцтва ў сацыялістычнае будаўніцтва краіны зьяўляецца адной з найбольш актуальных задач. Дзяржаўныя пазыкі, якія былі выпушчаны, у прыватнасьці і 2-я пазыка індустрыялізацыі, рэалізаваны пасьпяхова. Горш абстаіць справа з насамі ашчаднасьці; трэба сцьвердзіць, што праца іх праходзіць вельмі слаба, асабліва на вёсцы. Мінулыя 4 месяцы новага аперацыйнага году па дасягнутых вынніках у галіне павялічэньня ліку ўкладчыкаў і ўкладаў адстаюць пад пагрозу выкананьне зацьверджаных урадам БССР кантрольных лічбаў на 1928-29 г., ня гледзячы на тое, што І-е паўгодзьдзе зьяўляецца найбольш спрыяючым для разьвіцьця ашчаднай справы.

Усё гэта выклікае неабходнасьць правядзеньня двухтыднёвіка ашчаднасьці. Гэты двухтыднёвік праводзіцца ў агульнасаюзным маштабе.

Прэзыдыумам ЦВК БССР ускладзена на камісіі садзейнічаньня рэалізацыі II-й пазыкі індустрыялізацыі адказная праца па правядзеньні і гэтай важнай новай кампаніі. Задачай камісіі зьяўляецца прыцягнуць да гэтай кампаніі ўвагу ўсёй грамадзянасьці, а таксама прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў ня працадзеньні ўсе ўстановы і арганізацыі.

МЭТАЙ КАМПАНІІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА:

1. Да 1 красавіка б. г. выканаць ня менш 75 проц. гадавога заданьня па ўкладчыках і ўкладах, што павінна даць прырост па БССР за час ад 1 студзеня да 1 красавіка ў 2590000 руб і 66000 укладчыкаў. Агульная сума ўкладаў на 1 красавіка, такім чынам, павінна дасягнуць па БССР 10390000 руб., а ўкладчыкаў—190000.

2. Дабіцца рашучага пералому ў разьвіцьці ашчаднай справы сярод сялянскага насельніцтва, дзе справа абстаіць яшчэ вельмі дрэнна. Пры гэтым, зразумела, не павінна быць аслаблена і праца ў гарадох.

3. Двухтыднёвік ашчаднасьці, дзякуючы шырокай агіткампаніі, павінен паслужыць штуршком да далейшай сыстэматычнай працы па ашчаднай справе.

Кампанія павінна пачацца не пазьней 15-20 лютага, да якога часу трэба правесьці ўсю падрыхтоўчую працу. На перыяд кампаніі пазікны быць вылучаны кадры падрыхтаваных агітатараў.

Як у перыяд падрыхтоўкі да кампаніі і асабліва пры яе правядзеньні пінен быць максымальным чынам актывізаваны ашчадны апарат асабліва па лініі паштова-тэлеграфнага ведамства, бо пазтовыя касы зьяўляюцца асноўнай сеткай ашчаднасьці на вёсцы.

У перыяд падрыхтоўкі, а таксама і перыяд самай кампаніі максымальным чынам трэба скарыстаць друк і насьценныя газэты.

Акруговыя камісіі прадстаўляюць пастаянай камісіі тэрміновыя даклады:

1. К 15 лютага—аб правядзеньні падрыхтоўкі і ступені падрыхтаванасьці акругі да кампаніі.

2. Пачынаючы з 15 лютага да 1 красавіка, кожныя 10 дзён, а ў часе двухтыднёвіка кожныя 5 дзён—сводку аб росту касьці ўпагнутых укладчыкаў і ўкладаў (фізычных асоб) і вестак аб агульнай сетцы ўкладаў і ўкладчыкаў.

За час ад 1 студзеня да 1 красавіка кожнай акрузе павінна быць упагнута і ступная колькасьць новых укладчыкаў і ўкладаў:

	Укладчыкаў.	Укладаў
Менская	13.000	500.00
Віцебская	11.000	500 00
Гомельская . . .	9.000	390.00
Магілеўская . . .	8.500	375 00
Бабруйская . . .	8.000	300 00
Аршанская. . . .	7.500	200.00
Мазырская . . .	5.000	175 00
Полацкая . . .	4.000	15 .00

Прычым з агульнай сумы ўкладаў уклады фізычных асоб павінны складаць не менш як 75 проц.

Акруговыя камісіі садзейнічаньня сумесна з Акрфа і акруговымі касамі ашчаднасьці павінны даць заданьні райёнам размеркаваўшы іх паміж гарадам і вёскай.

Старшыня камісіі па правядзеньні ў БССР двухтыднёвіка ашчаднасьці А. ХАЦКЕВІЧ.

5 лютага 1929 г. гор. Менск.

У ЛІТВЕ.

Становішча ў Літве.

КОЎНЯ. 4 2. Афіцыёз «Летувос Айдас» аналізе чуткі аб палітычных зьменах, якія вібыта адбудуцца ў Літве. «Літоўская апазіцыя,—піша газэта,—і некаторыя варожыя чужаземным сфэры ўжо трэці год чакаюць разыгрываньня ў літоўскім урадзе. Гэтыя чаканьні дарэмныя, бо па ўсіх прынцыповых пытаньнях у літоўскім урадзе поўная адзінасьць поглядаў».

ГАЛАДОЎКА Ў КОВЕНСКІМ АСТРО ЗЕ ЛІКВІДАВАНА.

КОЎНЯ, 4-2. Газэты паведамляюць, што галадоўка 90 палітычных зьняволеных ковенскага астрогу ліквідавана 2-га лютага увечары. Патрабаваньні зьняволеных пакінешыць асьвятленьне і стварыць гігіенічныя ўмовы прызнаны безнадстаўнымі.

Галадоўка вязьняў у Коўні.

Нядаўна ў ковенскім астрозе, дзе трывае галадоўка палітычных вязьняў, узьнікі і на адкі, выкінаныя праваначальным захаваць ем астрожнай варты.

Па загаду начальніка астрогу зроблена была рэвізія ў нам-рах галадуючых вязьняў і „знойдзена" схаваная жыўнасьць, якая быцыам служыць для падтрыманьня забастоўкі, ня потым аказалася, астрожная варта, жадаючы сканфіскаваць галадуючых, у часе рэвізіі падкінула ў нам-рах хлеб і пот м яго «знайшла».

Вестка аб прыняцьці хутка абяцала астрог і вязьні пачалі ламаць мэблю і жадаць прыбыцьця пракурора.

Сьмерць 5 палітвязьняў.

«Глос Праўды» паведамляе, што ў сувязі з гал. доўкай палітвязьняў, у якой прымаюць удзел да 160 асоб, пяць палітвязьняў шэсьта памерлі з голаду.

Банкрутцвы

Лік банкрутцваў у 1928 г., у параўнаньні з 1927 г., значна ўзрос. У параўнаньні з апошніх 3 месяцаў збанкрутавала 30 фірм на суму 12 мл. літаў. Большасьць банкрутцваў прыпадае на каапэрацыйныя т-вы, 50 проц. на мануфактурны гандаль.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Коўні.

Гэтымі днямі ў Коўні перад памяшканьнем пасрэдніцтва працы сабралася каля 200 беспрацоўных, якія дамагаліся працы. Калі просьба іх ня была задаволена, дык беспрацоўныя зрабілі дэманстрацыю і накіраваліся на Алею Вольнасьці. Паліцыя разагнала натоўп, арыштаваўшы 12 асоб. Праз дзьве гадзіны натоўп зноў сабраўся і накіраваўся да міністра працы, які прыняў делегацыю і абяцаў даць працу ў Клайпэдзкім порце і пры разборцы фартоў.

У абароне аўтаноміі унівэрсытэту.

Спэцыяльная камісія рады ковенскага унівэрсытэту апрацавала мэмарыял, які матывіруе абавязковасьць утрыманьня аўтаноміі літоўскага унівэрсытэту. Гэта зьяўляецца адказам на ўрадавы праект новага статуту унівэрсытэту.

Забастоўка вучняў у Плунгянах.

«Слово» (№ 24) паведамляе, што ў Плунгянах (Літва) забаставала 293 вучні і не зьяўляюцца ў гімназію. Прычынай забастоўкі зьяўляецца нежаданьне ўнасіць плату за навучаньне. Міністэрства асьветы выдалегавала да Плунгян свайго прадстаўніка.

Колькі маёнткаў падзелена?

Паволле афіцыяльных даных, апублікаваных у Коўні, ад 1919 да 31 сьнежня 1929 г. г. ё. у працягу 10 год падзелена на хутары у Літве 1799 вёсак, абшарам 495.580 гэкт. і распарцэлявана: у Шавельскім пав.—306 маёнткаў, абшарам 59.681 гэкт.; у Паневежскім—276 маёнткаў, абшарам 42.644 гэкт.; у Таўрогенскім—225 маёнткаў, абшарам 25.818 гэкт.; у Троцкім—207 маёнткаў, абшарам 34.629 гэкт.; у Ковенскім—203 маёнткаў, абшарам 35.061 гэкт. і г. д.

Кантрактацыя—першы крок на шляхох каапэраваньня сялянства.

Пытаньне аб узмацненьні кантрактацыі сельска-гаспадарчых прадуктаў было вырашана яшчэ на 15 зьезьдзе партыі ў канцы 1927 г. У мінулым годзе яна пачала ўжывацца ў цэлым шэрагу райёнаў. З сялянамі ўтваралісь дагаворы на здачу дзяржаве прадуктаў сельскай гаспадаркі, прычым сялянству выдаваліся адпаведныя ссуды. Шырока практыкавалася кантрактацыя засеваў тэхнічных культур: лёну, буракоў і інш Паступова ўводзілася кантрактацыя і на збожжавыя прадукты.

Асноўным недахопам першага году працы па ўзмацненьню кантрактацыі было тое, што кантракты ўсё-ж слаба служылі справе падвышэньня якасьці, а таксама і павялічэньня колькасьці прадуктаў. Апроч таго, кантрактацыя вельмі слаба выконвала ролю рычага для сапраўднага вытворчага каапэраваньня бядняцкіх гаспадарак. Над гэтымі задачамі перавагу браў камэрцыйна-крэдытны характар кантрактацыі, іншымі словамі дзяржаўныя органы і каапэрацыя, якія правялі справу кантрактацыі, забывалі галоўнейшую задачу—арганізацыю беднаты і палепшаньне яе гаспадаркі.

У сучасны момант, калі пастаўлена вельмі шырока пытаньне аб падвышэньні ўраджайнасьці, і ня толькі серадняцкіх, але і бядняцкіх гаспадарак, кантрактацыя павінна адыграць у гэтай справе галоўнейшую ролю. Трэ а перш усяго дамагчыся, каб крэдыты, якія адпускаюцца дзяржавай, былі скарыстаны ў першую чаргу па лініі паз вышэньня ўраджайнасьці, прычым у першую чаргу бядняцкіх гаспадарак. Разам з тым кантрактацыя павінна прадугледжваць увядзеньне ў сельскую гаспадарку найбольш удасканаленых спосабаў земляробства. Неабходна дамагацца сартавых пасеваў, угнаеньня глебы, ужываньня плугоў, трактараў і іншых сельска-гаспадарчых машын і прыладаў. Кантрактацыя павінна стаяць на першае месца, як пераходны этап ад індывідуальных форм гаспадараньня да каапэрацыйных. Надзвычайна важна, каб тыя дзяржаўныя органы, які прыходзіцца ўтвараць дагаворы з сялянамі, паставілі сабе задачай дастаўляць у вёску ня толькі сартавое насьньне, але і тыя машыны і хімічныя сродкі, якія забясьпечваюць больш высокі ўраджай і больш высокую якасьць прадукцыі.

Таксама можна дабіцца праз кантрактацыю і ўвядзеньня ў сялянскае гаспадарцы такіх метадаў апрацоўкі прадуктаў сельскай гаспадаркі, які давалі-б найбольшую выгаду як селяніну-вытворцу, так і падпісваючаму з ім дагавор спажыўцу.

Клясавая лінія ў правядзеньні кантрактацыі зводзіцца да таго, каб выгадамі, у першую чаргу, карысталіся серадняк і беднак. Пагэтаму вельмі важна, каб кантрактуючыя органы мелі заўсёды на ўвазе інтарэсы ўзьнімаць гаспадарку ўсёй масы сялянскіх гаспадарак, а не паасобных заможных пластоў вёскі.

Неабходна таксама памятаць пры правядзеньні кантрактацыі, што яе задача—гэта ўзмацненьне сьмычкі паміж бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства і рабочай клясай. Гэта сьмычка будзе больш моцнай, калі будуць улічаны запыты і патрэбы гэтых мас у дэлым. Камэрцыйныя меркаваньні, якія часамі дыктуюць утварэньне дагавораў з найбольш заможнымі пластамі сялянства, павінны быць адкінуты.

Кантрактацыя—першы крок на шляхох каапэраваньня сялянства, гэта першы мост да ажыцьцяўленьня тых задач, якія ставіў яшчэ У. І. Ленін, зазначаючы, што, каапэруючы сялянства, мы вырашаем задачу пабудовы сацыялізму ў нашай краіне. А. Ш.

„УСЕСАЮЗНЫ ДВУХТЫДНЁВІК АШЧАДНАСЬЦІ" ПАВІНЕЧ ДАЦЬ РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У РАЗЬВІЦЬЦІ АШЧАДНАЙ СПРАВЫ СЯРОД СЯЛЯНСТВА.

Школьныя дзялянкі—апорныя базы ў барацьбе з ўраджай.

Сучасны стан сельскай гаспадаркі нашай краіны не адпавядае запатрабаваньням, якія вынікаюць з задач індустрыялізацыі краіны і адбудаваньня гаспадаркі на сацыялістычных падставах. Старажытны спосаб гаспадараньня, пераважнае панаваньне прасялосінны, адсутнасьцю імкненьня нашага дробнага земляроба да штучных угнаеньняў — усё гэта ня спрыяе ўзьнаўленьню сельскай гаспадаркі да ўзроўню запатрабаваньняў сацыялістычнай грамады.

Ураджайнасьць беларускіх палёў нізкая, а значыць і база ўсёй прадукцыі гаспадаркі нашай краіны пятрыхала.

У зьвязку з гэтым задача па ўзьнаўленьню ўраджайнасьці—адна з самых важных задач, без вырашэньня якой Беларусь ня можа разьвівацца належным тэмпам, без вырашэньня якой нельга паляпшыць дабрабыт рабочага і селяніна, нельга вывесьці з бяднасьці, нельга ўзьнавіць культурны стан краіны, каб з большым посьпехам замацоўвацца сацыялістычны лад. Таму Савет Народных Камісараў БССР сваей пастановай ад 20 га сьнежня 1928 году і высоўвае заданьне ўсім органам народнай гаспадаркі Беларусі, усім навукова-дасьледчым і культурна-грамадзкім установам і арганізацыям, усім працоўным пянігодьдзя «павялічыць ураджайнасьць у параўнаньні з цяперашнімі ўраджаямі, асноўных зернавых культур на 35 процантаў, а ў савецкіх гаспадарках на 50-60 процантаў, лёну і канапель—на 40 процантаў і іншых—ня менш як на 20 процантаў». Такую ж пастанову аб узвышэньні ўраджайнасьці выдаў і Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюзу ССР.

Дзеля найбольш поўнага выкананьня пастановы Саюзнага ўраду і ўраду БССР патрэбна як мага большае пашырэньне элемэнтарных сельска-гаспадарчых ведаў на вёсцы, узьнікцьце культурнага ўзроўню беднаты і серадняцтва, а таксама рашучае палепшаньне справы падрыхтоўкі працаўнікоў, патрэбных дзеля сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Выкананьне гэтай задачы павінна пачацца зараз-жа, і першым стрэлам у практычным яе вырашэньні павінна быць надыходзячая вясенняя сяўба.

Значную ролю ў гэтай справе павінна адыграць наша вясковая школа, якая праз сваіх вучняў густымі нітямі зьвязана з пераважнай большасьцю сялянства. Гэту сувязь магчыма ператварыць у гігантскую сілу ў барацьбе за лепшы ўраджай, але пакуль што нашы школы, у агульнай іх большасьці, яшчэ далёкі ад запраўднага ўплыву на ўзьнаўленьне вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

А магчымасьці да гэтага нашы вясковыя школы маюць досыць сталыя.

Яшчэ ў першыя гады рэвалюцыі амаль што ўсе школы надзелены зямлёй. На гэтых надзелах пастаўнікі павінны даць прыклад лепшай апрацоўкі зямлі, разьвіцьця больш прадукцыйных культур, ужываньня штучнага ў насьнёвы, а таксама, і гэта адна з галоўных задач школы, прывіць вучням навыкі калектыўнай працы на зямлі і паказаць школьнаму сялянству вынікі гэтага калектыўнага спрацоўніцтва.

Ці выканалі нашы школы ў сваёй масе гэту ролю прапагандыста ў сельска-гаспадарчай галіне? На жаль, станоўчага адказу на гэта запытаньне мы яшчэ даць ня можам. Нашы школы ў сваёй масе гэтага плацдарму ў вёсковай гаспадарцы пакуль што не запалі. «Няма матар'яльных сродкаў на наладжаньне паказальных вучасткаў»,—„мясцовыя органы не дапамагаюць», „няма кіраўніцтва» і г.д. і г. д.—вось адказы значнай часткі асьветнікаў на пытаньню аб удзеле ў працы па ўзьнаўленьню ўраджайнасьці і аб наладжаньні паказальнай працы на школьнай зямлі.

Безумоўна, усе гэтыя фармуліроўкі маюць пад сабой грунт, і грунт досыць сталы, але гэта не павінна канчаткова пагасіць творчы ўздым нашай школы, на чае пастаўніцтва і сялянскай дзеткі Матар'яльныя сродкі на гэту справу павінны знайсьціся, а асьветнікам і самім трэба аб гэтым паклапаціцца, мясцовыя органы ўлады, гаспадарчыя і культурна-грамадзкія арганізацыя са свайго боку павінны дапамагчы, а кіраўніцтва — неадкладна наладзіць. Шырокія грамадзкія колы, наша сялянства—таксама не пакінуць школу ў адзіноце. Мы маем, напрыклад, факты, калі сяляне пры вырашэньні пытаньня аб самаабкладаньні паўную частку сродкаў вылучаюць на арганізацыю паказальнага зямельнага вучастку пры школе, на разводку саду (Гарочыцская школа на Мазыр шчыне). Дакажыце селяніну, што вы дбаеце аб яго дабрабыце, што вы здольны быць для яго карыснымі, і ёй у вас не застанецца ў даўгу.

Некаторыя школы зразумелі сваю ролю ў справе перабудовы сельскай гаспадаркі і ў значнай меры ступілі на гэты шлях. Напрыклад, Насовіцкая школа на Мазыршчыне яшчэ ў мінулыя гады на школьным вучастку падала прыклад засеву коранплодаў, канюшыны і лубіну, і сяляне ўжо скарысталі гэты прыклад і яны, убачыўшы карысьць ад такой навіны, пачыналіся абнавіць свае палеткі. А зараз, усвяціўшы сабе лёзунг уплыўнасьці ўраджайнасьці, тая-ж Насовіцкая школа ўзялася зьбіраць попел. Зьбірае са сваіх печак, купляе ў дзетвары па 10 капеек за пуд і ўжо такім чынам насыпала гэтага незамяніма а угнаеньня 50 пудоў, а на вясны мяркуе сабраць аж 100 пудоў («Працаўнік Асьветы» № 4 за 3 лютага). Такая праца безумоўна дасьць непараўнаны эфэкт, і школьная зямля, заадоленая попелам, будзе лепшым прыкладам ураджаю на штучным угнаеньні.

Лысагорушчынская школа на Аршанш чыне легась разьвіла сваю дзялянку на шматпольле і засеяла яе перважна буракамі, бульбай і канюшынай. Працавала ўся школа калектыўна, калектыўна і спажывае ўраджай: за прыбытак наладзіла для беднаты гарачыя сьнеданьні—галодную гарбату з кавалкам хлеба. Школа нават мяркуе купіць карову, каб вучні маглі навучыцца правільна даглядаць і карміць жывёлу.

Мы маглі б прывесьці і яшчэ шмат такіх прыкладаў, якія кажуць, што частка нашага настаўніцтва ажыцьцяўляе працоўны прынцып нашай школы, увязвае штодзённую працу школы з акаляючым жыцьцём сучаснай грамады, бачучы такім парадкам чыны ўдзел у перабудове сельскай гаспадаркі на сацыялістычных рэйках. Але, на жаль, гэтыя прыклады не зьяўляюцца агульнымі для ўсіх школ, яны не характарызуюць пазыцыі ўсіх школ у гэтай важнай справе

У нас ёсьць ворах матар'ялаў, сельскараўскіх дапісаў, якія кажуць, што вясельныя дзялянкі большасьці школ нарнеюць, на іх ня толькі не видзецца ніякай паказальнай працы, а наадварот, яны нязнана цягнуцца у хвасьце праведаўскай дробна-сялянскай гаспадаркі, не пазаючы пакуль што і іскры надзеі на адраджэньне. Некаторыя дзеці ўсім лажэць дзерэвам, іншы ж калі і засяваюцца сакітак, дык у кожным разе не выкарыстоўваюць дзеля прапаганды ў справе сельска-гаспадарчай рэвалюцыі.

Матар'яльнай карысьці школе такія дзялянкі таксама не даюць, а калі і ёсьць які ўраджай, дык і той часам трапляе проста ў асабовую кішэню настаўніка. Напрыклад, загадчык М-Гарадзячынскай школы Лабовіч (Бабруйшчына) за чатыры гады ня даў ні капейкі ў карысьць школы. Ён аддаваў школьную зямлю на частку сялянам-беднякам, а прыбытак ад такой «культурнай» апрацоўкі клаў сабе ў кішэню. І толькі сёлетні справаздачна перавыбарчы сход сялян М-Гарадзячынскага сельсавету, які агулам ахарактарызаваў працу настаўніка Лабовіча, мабыць спыніць у далейшым такі пільны клопат настаўніка Лабовіча аб сваёй уласнай асобе.

Ёсьць выпадкі, калі за гэтыя самыя школьныя дзялянкі пачынаецца грызьня паміж паасобнымі настаўнікамі, якія жадаюць мець дачыненьне да ўраджаю. Справа даходзіць нават да канфліктаў ато і да судоў. Часам і райвыканкомы ды сельсаветы ўмешваюцца ў справу эксплёатацыі школьнай дзялянкі, і праз гэта псуюцца узаемаадносіны паміж настаўнікамі і цізанымі савецкімі органамі, што ў сваю ч

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Ганебны выпад супроць настаўніцы.

У Беларускім інстытуце глуханяных, які знаходзіцца у г. Аршанску, працуе малодая настаўніца Радкевіч. Ня так даўно на старонках газеты «Зьвязда» былі зьмешчаны два артыкулы аб падзеях у інстытуце. Тут прычапілі і настаўніцу Радкевіч. Яе назвалі жонкай загадчыка і разам з тым прыпісалі ей і бішьцё дзяпей. Але ўсё зло ня ў тым, што яе завуць жонкай загадчыка інстытуту. У гэтым сораму няма, бо рана ці позна чыей небудзь жонкай быць трэба, а таму-ж жонка ў вас—асоба паважаная. Але бяда ў тым, што настаўніца Радкевіч ня жонка загадчыка і ёю ніколі ня была ні юрыдычна, ні фактычна.

Хлусьню гэту пацьвердзіла і камісія, якая рабіла разгляд справы ў інстытуце і складалася з адказных асоб: райінспектара асьветы Сарокіна, дырэктара Белпедтэхнікуму Серафімава, прадстаўніка саюзу Лунина і запікаўленага ў справе настаўніка Махнача, які цяпер старшыня мясцкому працасьвету. Разгледзіўшы справы, камісія піша, што настаўніца Радкевіч фаварытка, у дужках настаўлена «любоўніка», загадчыка інстытуту.

Калі Радкевіч даведалася аб такіх зьвадах камісіі, дык, вядома рэч, абурылася на такую глусьню. Камісія нават не пацікавілася тым, хто такая Радкевіч, дзе і як яна працуе. І раптам назвала яе амаль што праституткай. Настаўніца Радкевіч прыбушавала была пайсьці да доктара, які агледзеў яе і выдаў пасьведчаньне, што Радкевіч дзяўчына і палавым жыцьцём ня жыла.

Як адчувала і адчувае сябе настаўніца,—кожны можа сабе ўявіць. Вінаўнікі хлусьні і вухам не вядуць, як быццам так і трэба. Абразілі нападую дзяўчыну і супакоіліся. Радкевіч пакіроўвае заяву пракурору рэспублікі аб тым, каб дапамагчы ёй абараніць яе добрае імя і прыцягнулі да адказнасьці вінаватых. Напісала яна і ў рэдакцыю „Зьвязды“.

Думаецца, што рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“, якая заўсёды стаіць на абароне асьветніка, таксама дапаможа настаўніцы Радкевіч дабіцца праўды, каб „адказных“ прыцягнулі да адказнасьці, бо ня трэба марань імя чалавека, які вінаваты толькі ў тым, што знаходзіцца ў добрых адносінах з адміністрацыяй і выконвае свае абавязкі шчыра. Калі яна зрабіла злачынства, дасьледзьце, пакарайце, але аб яе злачынствах нідзе нічога няма. Спадзяёмся, што ЦК Саюзу Асьветнікаў і Наркамасьветы зьвернуць увагу на гэту справу.

І яшчэ адна дробязь. Настаўніца Радкевіч думала накіраваць справу ў суд, прыклаўшы сваё пасьведчаньне, але ёй гэта зрабіць не далі: пры вобыску, які быў у інстытуце, забралі чамусьці не пасьведчаньне, ня выдаўшы копію. Ці правільна гэта? Такім чынам застаецца надзея на вышэйшыя органы і друк.

Амсьлісьвауль.

Вона.

Дапамога бедным вучням.

Справу ўзварухнулі.

(Менская акруга. Койданоўскі раён).

З пачатку 1928-29 навучальнага году школьная рада Койданаўскай беларускай сямігодкі стварыла спэцыяльную нараду па дапамозе бедным вучням. Па ініцыятыве вучкому на класных сходах праведзены гутаркі аб значэньні дапамогі бедным дзецям-школьнікам; тут-жа быў пушчан падпісны ліст, які даў 10 р. 66 к. Школьная рада на сваім пасяджэньні пастанавіла забясьпечыць бедных вучняў падручнікамі і пісьмовымі прыладамі; на гэту справу ад вушчана са сродкаў сямігодкі 196 р. 72 к. і гэта дало магчымасьць поўнасьцю забясьпечыць падручнікамі 13 вучняў.

РВК выдзеліў у фонд дапамогі школьнай беднасьці 91 руб. Вучком разам з камсамольскай ячэйкай наладзіў платны вечар-спэктакль у карысьць бедных дзяцей, прыбытак з якога складае 103 р. 45 к. Такім чынам у фонд дапамогі бедным вучням ужо сабрана 435 р. 39 к. З гэтых сродкаў выдзелена адна гадавая стыпендыя у 25 руб. сыну загінуўшага барацьбіта за вызваленьне Беларусі. Папыта: 9 сьвітак, 9 пар канцы, 1 боты, 2 сукенкі і 2 шапкі. Усяго атрымалі дапамогу 37 дзяцей нестачковай і ясковай беднаты.

Зараз Койданаўская беларуская сямігодка рыхтуе сваімі сіламі чарговы вечар-спэктакль, з ор ад якога пойдзе на дапамогу школьнай беднасьці. **А. С.**

Шукаем сродкаў на вопратку.

(Старобінская беларуская сямігодка, Бабруйшчына).

У Старобінскай беларускай сямігодцы пераважна вучыцца сялянская беднота акалічных вёсак. Жаданьне вучыцца да таго вялікае, што дзеці за 6-7 вёрст штодзень ходзяць у сямігодку. Хадзіць так далёка ў школу нялегка. Асабліва цяжка гэта дзецям сялянскае беднаты, якія ня маюць ні добрае вопраткі, ні абутку, а ў бацькі падчас няма кана, каб надвезьці вучня ў школу. Пытаньне дапамогі бяднейшым вучням школы стала на першай чарзе. У працы нашае школы з пачатку 1928-29 навучальнага году і зараз у гэтай справе мы маем наступныя дасягненьні.

Пашыраны і арганізаваны інтэрнат пры сямігодцы. Дзякуючы гэтаму у інтэрнаце знаходзіцца 25 бяднейшых вучняў. У інтэрнаце ёсьць асобныя памяшканьні для хлапцоў і для дзяўчат. Пры інтэрнаце арганізавана харчаваньне вучняў інтэрнату. Дзеці кожны дзень тры разы атрымліваюць сьнеданьне, палудзень і ўвечары гарбату. Кожны з вучняў уносіць належную частку харчу у кацел. Апрача ўяго гэтага, школа ўвесь час клапацілася аб адшуканьні сродкаў на дапамогу беднаце вопраткай, абуткам і інш. У выніку школа гэтыя грошы здабыла і ўсім бедным вучням заказана вопратка і абутак.

Варшал Майсей.

2-хтыднёв'к аховы здароўя.

Як паказвае практыка, правядзеньне ў мінулым годзе ў навучальных установах «тыднёвіка», а ў некаторых месцах месячніка аховы здароўя дало досыць добрыя вынікі.

Дзеля далейшага палепшаньня санітарнага становішча школ і іншых устаноў сацвыху Па, камасьветы і Наркамздраў далі на месцы дырэктывы аб правядзеньні і ў гэтым годзе «2-х тыднёвіка аховы здароўя».

У праграму правядзеньня 2-хтыднёвіка паложены затачы; агляд навучальных устаноў дзеля выяўленьня санітарна-гігіенічных недахопаў і вызначэньне практычных мерапрыёмстваў дзеля іх зьнішчэньня. У час 2-хтыднёвіка будзе праведзена праверка гігіенічных звычак дзяцей у іх асабістым і грамадзкім жыцьці як у школе, так і дома.

Наркамасьветы і Наркамздраў далі шэраг канкрэтных указаньняў—што трэба правесьці і зрабіць на месцах у часе 2-хтыднёвіка аховы здароўя.

НАЛАДЗІМ ПАКАЗАЛЬНАЕ ПОЛЕ.

(Шклоўскі раён, Магілеўшчына).

Нядаўна адбыўся сход настаўнікаў падрайёну Гарадзішчанскай апорнай школы. На сходзе ішла гутарка аб працоўнай школе і яе задачах у сувязі з задачамі сав. улады па падвышэньні ўраджайнасьці. Абгаварыўшы гэта пытаньне і ўлічыўшы тое, што зямельныя вучасткі пры школах скарыстоўваюцца праз арэнду і нічога не даюць паказальнага для акаляючага насельніцтва, а таксама мала даюць карысьці і для самой школы, сход настаўнікаў зрабіў пастанову, каб на зямельным вучастку аднэй з школ падрайёну з надыходам вясны закласьці дасьледчае поле.

Зямельны вучастак будзе апрацоўвацца сіламі саміх настаўнікаў і па ўказаньнях агранома.

Сход даручыў аднаму з настаўнікаў, які добра знаём з сельскай гаспадаркай, каб ён распрацаваў практычны плян гэтае працы, каб з вясны магчыма прыступіць да яе выкананьня.

Ажыцьцяўленьне гэтай пастановы дасьць настаўнікам шмат карысьці. Папершае, гэта паказа, як практычна перайсьці да апрацоўкі школьных зямельных вучасткаў самой школай. Падругое, настаўнікі ў працэсе самай працы будуць падвышаць свае веды па сельскай гаспадарцы і прыродазнаўству.

Патрэцяе, усе набытыя веды і матар'ялы настаўнікі ў наступным навучальным годзе ўвяжуць з комплекснымі праграмамі, што зробіць школу больш жыцьцёвай.

А. ШЛЯХТАЎ.

Мерапрыёмствы НКА да пасеўнай кампаніі

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы пастаноўлена правесьці шэраг мерапрыёмстваў у галіне падрыхтоўкі да вясеннай пасеўнай кампаніі. Не пазьней 15 лютага па ўсіх раёнах будуць адчынены для сялянактывістаў тыднёвыя курсы-канфэрэнцыі. Прызнана неабходным арганізаваць цыкль радыё-лекцый на сельскай гаспадарцы з менскай радыё-станцыі. Галоўпалітасьветы даручана выдаць спэцыяльны плякат, прысьвечаны пасеўнай кампаніі. Плякат будзе выдадзены да 1 сакавіка і будзе дасланы па ўсіх школах, хатах-чытальнях і вёсках.

Побач з гэтым усім акруговым інспэктарыятам даручана выпісаць для хат-чытален і нардамоў спэцыяльна падабраныя бібліятэчкі. Белдзяржкіно таксама даручана абслужыць пасеўную кампанію: будуць у вясковых кіно-перасоўках дэманстравацца спэцыяльныя лёзунгі, 1-2 кіно фільмы на тэму пасеўнай кампаніі. Калегія НКА згадзілася з арганізацыяй камісіі на правядзеньню мабілізацыі студэнтаў аграфаку с.-г. акадэміі дзеля абслугоўваньня вясеньняй пасеўнай кампаніі. Праўленьню с-г. акадэміі запрапанавана дагаварыцца з НКЗ аб матар'яльным забясьпечаньні студэнтаў, якія будуць мабілізаваны для правядзеньня пасеўнай кампаніі.

Трэба дапамагчы школе.

Смалявіцкая беларуская сямігодка зьяўляецца адзінай на раёне і зьмяшчае ў сваіх сьценах 480 вучняў. Займае яна два памяшканьні і абодва незадавальна да гігіенічна-гігіенічных умоў працы. Галоўнае памяшканьне на Прудавой вуліцы цёмнае, сырое, большая палова вокан на поўвач, калідор цёмны. Кожны год б. загадчык рамантаваў гэта памяшканьне, укладваў добрыя сродкі, але праз месяц печы развальваліся, тынькоўка абвалівалася. На стаху не знарачаўся доўгі час увагі і галы тры яна ляжала, пакуль не перакрылі адной часткі; але ж і другая, што рэшата.

Клясная мабліёўлае сабой руіны, на якіх нельга сядзець, бо яны ледарам ходзяць. Вучняў у клясах па 55—60, навучаючы ад 4 групы, і яны ў большасьці стаяць, а калі ідзе пісьмовая праца, дык вучні прымаюць позы, як тыя запарожцы што пісалі пісьмо султану.

Бібліятэкі вучнёўскай амаль што няма. Кнігі ў настаўніцкую бібліятэку набываліся толькі тым выкладчыкам, якія былі ў хаўрусе з б. загадчыкам. Фізычнага габінету зусім ня было і ня прымаліся крокаў да яго набыцьця.

Чамусьці сёлета на кантрэсу няма нічога на гаспадарчыя выдаткі школы, што ставіць школу ў безвыходнае становішча. Трэба АВК зьвярнуць на гэта ўвагу і даць належныя сродкі для падтрыманьня школы.

С.

IV усебеларускі зьезд інспэктараў нарасьветы.

Калегія Наркамасьветы канчаткова вырашыла склікаць IV усебеларускі зьезд інспэктараў народнай асьветы на 20 лютага. У працы зьезду, апрача акруговых інспэктараў, прымуць удзел усе раённыя інспэктары нарасьветы. Запрошаны на зьезд таксама прадстаўнікі вядтэхнікумаў. У працы зьезду прыме ўдзел звыш 150 дэлегатаў, і зьезд працягнецца 5-6 дзён.

НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

— На допіс «За нарабабой тва вучняў—далоў з праны» („Сав. Бел № 290 за 18-XII-28 г.) Інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньню НКА паведамляе, што факты зазначаныя ў допісе пацьвердзіліся, за што настаўніца Дарожкаўская школы Шчэрбакова зьнята з працы і справа аб ёй перададзена ў суд. Што датычыцца з'ядчыны Дарожкаўскай школы Шкапцовай, то ёй зроблена вымова з завісаньнем у асабовую справу.

— На допіс «Прызначаюць, а пасьля звальняюць», зьмешчаны ў газэце «Савецкая Беларусь» № 281-(2472) за 11 сьнежня 1928 г., Інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньню НКА паведамляе, што на гэтаму допісу было зроблена дасьледаваньне, з якога выявілася наступнае: 1) Настаўніца Міроў па ня м е ня толькі надагагічнай асьветы, але вельмі малавузкую агульную асьвету. 2) Летась яна прызначана ў школу з тае прычыны, што ня было лепшых кандыдатаў. 3) Калі выявілася пры дасьледваньні, што Міронава зусім не знаёма з працай у школе, яна была прызначана на курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў, але за апошніх выявілася, што Міронава малакісьменная асоба і мае зусім ня водае дробаў, чаму яна і звольнена з пасады.

— На сутнасьці допісу „Школа не багадзельня“ („Савецкая Бел[illegible] № 286 за 13-XII-28 г.) інспэктар [illegible] аддзела раёну Мазырскай акругі дае наступнае тлумачэньне:

Выкладчык сьпеву Слабадзкой сямігодкі тав. Ганчарык сапраўды груба адносіўся да вучняў, але школьной радай былі своечасова ўжытыя належныя меры, і малодыя зьвяшчы ў далёкім былі зьвінчаны. Адносна гладжэньня сьпічком па галаве вучняў, дык гэта быў усяго адзін выпадак з мэтаю запрадчаньня вучня, які кінуўся другой справай. У справе яго хваробы прапанавана ў хуткім часе прадстаўніць ад урачэбнай камісіі дакумэнты аб яго здароўі, пасьля чаго будзе канчаткова вырашана пытаньне аб яго далейшай працы ў школе.

Па справе т. Дроніча, часова замяшчаючага на выкладаньню грамадазнаўства тав. Каваленка, высьвятлена наступнае: т. Дронік—член КПБ, сэкратар масковай ячэйкі —палітычна разьвіты, выкладае прадмет на комплексной сыстэме дастатковa, вучні вельмі здаволены яго выкладаньнем.

Узмацнім падрыхтоўку да сяўбы.

МАРУДНА РЫХТУЮЦЦА.

(Гомельшчына).

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі разгортваецца надзвычайна марудна. Ня гледзячы на тое, што ў акрузе ёсьць добра прапрацаваны плян, выкананьне якога дало-б магчымасьць мець шэраг дасягненьняў у разьвіцьці сельскай гаспадаркі, месцы яшчэ не распачалі сваю працу. Дырэктывы акругкому партыі і акрвыканкому аб належнай увазе да гэтай кампаніі застаюцца ня выкананымі. Ачыстка насеньня праходзіць надзвычайна слаба. Плян кампаніі па ачыстцы 900 тысяч пудоў насеньня знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Асноўная прычына—індыферэнтнасьць працаўнікоў райёну, а ў некаторых раёнах недапушчальна нядбайныя адносіны у падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной кампаніі. Вось факты:

У вёсцы Мільча зерноачышчальны абоз ачысьціў 4 пуды насеньня, загадчык абозу п'янствуе; аграном ведае пра гэта, але ніякіх мер ня прымае. У вёсцы Луганах зерноачышчальны абоз прастаяў 6 дзён бяз працы; у Жгунскай-Будзе 3 дні абоз не працаваў. У савгасе Хопуць, Дабрускага раёну, абоз бязьдзейнічае; кіраўнік савгасу лічыў лішнім паведаміць пасёлкавых сялян аб зерноачышчэньні.

Пастанову ўраду аб тым, што ачышчэньне зярна сёлета зьяўляецца абавязковай, акрэмаддзел разаслаў па раёнах толькі 25 студзеня—замест рассылкі ў лістападзе, а райвыканкомы мабыць разашлюць у сакавіку месяцы.

Райвыканкомы і райаграномы ў некаторых раёнах нядбайна адносяцца да вясеньняй пасяўной кампаніі. У адным з раёнаў аграном у працягу двох тыдняў ня мог прадставіць свой плян вясеньняй кампаніі на абмеркаваньне райвыканкому. Між тым, пры належнай увазе да выкананьня дырэктыў партыі і мабілізацыі ўвагі насельніцтва да вясеньняй сяўбы распрацаваны плян акрземаддзелу ног-бы быць поўнасьцю выкананы. Сёлета наша акруга забясьпечана машынамі поўнасьцю.

Палітасьветныя ўстановы, школы і інш. грамадзкія арганізацыі жывога ўдзелу ў гэтай кампаніі ня прымаюць. Управа палітасьветы абмежавалася рассылкаю адпаведнага цыркуляру..., рэшта арганізацый рыхтуюць абежнікі і лічаць сваю місію скончанай. У гэтай адносіне райённыя працаўнікі правільна гавораць: «Не пасылайце нам абежнікаў на 22-х старонках (ТДА-Авіяхім разаслаў абежнік на 22 старон., асобныя падатковыя абежнікі аб перавыбарах саветаў былі пасланы ў райёны пасьля скончэньня перавыбарчай кампаніі), а давайце жывых людзей, дапамагайце і сачыце за тым, каб працаўнікі на тэй ці іншай лініі сапраўды займаліся актыўнай дапамогай».

Райвыканкомы пляны вясеньняй пасяўной кампаніі паклалі ў папкі, а ў некаторых раёнах старшыні райвыканкому мала знаёмы з планам вясеньняй пасяўной кампаніі. Напрыклад, у Гомельскім райвыканкоме плян вясеньняй кампаніі знаходзіўся у начальніка, а адказныя працаўнікі райвыканкому ня ведалі аб мерапрыёмствах па німу. У адным з раёнаў акругі аграном у працягу двух тыдняў ня мог дабіцца абмеркаваньня пляну на пасяджэньні райвыканкому. Праўда, райвыканкомы былі заняты перавыбарчай кампаніяй, але гэта ня значыць, што да такога важнага пытаньня, як вясеньняя пасяўная кампанія, трэба было адносіцца нядбайна.

Акругком партыі і акрвыканком прынялі меры да зьнішчэньня недахопаў па правядзеньню вясеньняй пасяўнай кампаніі.

У Хоцімскім раёне ачысткі насеньня не пачалі.

(Па тэлеграфу ад спэцыяльнага кар-та).

Тры абозы Хоцімскага раёну пушчаны толькі першага лютага. Чацьверты, адпраўлены ў паселішчы сельсавету трэцяга лютага, яшчэ не пачаў працы. Новы трыер гэтага абозу аказаўся сапсаваным. Зьвестак аб колькасьці ачышчанага насеньня ў раёне няма. Палессаюз ня выканаў яшчэ заяўкі на два трыеры. Калектывы маюць толькі сартыроўкі крэдытных таварыстваў, сваіх трыераў няма. Паселіцкі сельсавет для абозу даў гумно без варот. Райвыканком зацьвердзіў плян вясеньняй сяўбы першага лютага.

ЗАК.

Гуляюць у пасеўкампанію.

(Крупскі р., Аршанск. акр).

Тра-та-та... тах-тах...тах... Машыністка выстуквае мёртвыя літары, нараджаюцца словы, вырастаюць сказы. А потым паўстае складаная схэма грандыёзнага пляну пасеўнае кампаніі па Крупскаму раёну, Аршанскае акругі. З-за мёртвых шэрых літар выглядае адна з сур'ёзнейшых задач сёньняшняга дня—рэканструкцыя сельскае гаспадаркі, падвышэньня ўраджаю нашых палёў.

Тра-та-тах... тра-та-та. Ачысьціць 60 проц. насеньня... Узмацніць працу па калектывізацыі вёскі... Зьвярнуць увагу... Накіраваць агонь...

Райвыканкомаўцы працуюць, нервуюцца, робяць розныя фармуліроўкі, выпрацоўваюць рэзалюцыі на шматлікіх пасяджэньнях і... і гуляюць у пасяўную кампанію.

Толькі так мы можам кваліфікаваць працу Крупскага райвыканкому.

Беднота апынулася ў зачараваным коле, у цэнтры якога ўзьвіўся бюракратычна-кансэрватыўны апарат райвыканкому.

Пачнём з дробязяй.

Райземаддзелам пляны аб правядзеньні пасеўнай кампаніі, бюракратычныя казённыя пляны, разасланы ўсім сельсаветам, але тыя іх падшылі да спраў нават бяз нумароў, без рэзалюцый і не прачытаўшы.

Райвыканком прымушае аграномаў засесьці за такую-ж канцэляршчыну, як і сам. Ні сродкаў, ні кана, ні дапамогі: сядзі ў замураваных чатырох сьценах, выпрацоўвай рэзалюцыі для рэзалюцый, пляны для пляноў, дырэктывы для дырэктыў. Альбо, калі аграном непадатлівы чалавек, бары бяразвы кій і ідзі мераць сьнежныя прасторы. Хадзі ад вёскі да вёскі, як валацужнік, агітуй за ачыстку насеньня, за шматпольле, за калектывізацыю.

Сярод сялянства не папулярызавана зьбіраньне попелу. Вёска ня ведае аб карысьці гэтага таннага «возата», выкідае яго на двор, на вуліцу. У школах не праведзена авіяжкай працы па растлумачэньню дзецям карысьці попелу. А дзеці, пры належным растлумачэньні, магчы-б зацікавіцца гэтай працай.

Зьбіраюць-жа дзеці вясной таўкачыкі на полі для пялят... Гэта дасягнута выхаваньнем у сям'і. А чаму школе ня ўвяць ролю кіраўніка гэтым выхаваньнем.

Прыклады ўсяму гэтаму дае «сам» райвыканком. — Зьбіраць попел? Ха-ха-ха! Вось паднесьлі сюрпрыз!

Камітэты сялянскае ўзаемадапамогі, арганізатары ініцыятывы сялянства, абаронцы беднаты, што яны робяць? Нават такую тэхнічную дробязь ня выканалі, як складаньне сьпісаў па забясьпечаньню беднаты насеньнем.

За гэтымі дробнымі, на першы погляд, недахопамі хаваецца самае сапраўднае шкодніцтва калектывізацыі вёскі. Кіраўнікі райёну па шаблёну, па новай савецкай бюракратычнай мерцы, прыкрыўшыся блёклай чырвонай афарбоўкай, агітуюць сялянства за шматпольле, за калектыў.

А практычна, у жыцьці, у горкай сапраўднасьці лічаць патрэбным бяз слоў, бяз славесная траскатні ліць ваду на капіталістычныя турбіны.

Яўрэйскі калгас „Новае Жыцьцё“ б'ецца як рыба аб лёд ад „адзінаправільнай“ палітыкі райвыканкому.

Гэта яны, райвыканкомаўцы, прымусілі сёлета калектыў працаць восем цельных кароў і аднаго каня з-за таго, што р йвыканком абяцаў даць сенажаць, а як надышоў сенакос—заграў яе сабе. Камунары і зарна хадайнічаюць аб надзяленьні сенажацьцю, і зараз, як летась, у райвыканкоме абяцаюць, а як надыдзе сенакос, РВК зноў сам скосіць яе.

Калектыў, па міласьці райвыканкому, даведзен да разбураньня, да настроў аб ліквідацыі, аб пераходзе на хутары.

Кансэрватыўная палітыка райвыканкому, з традыцыямі славутых сталыпінскіх хутароў, праводзіцца цьвёрда і ўпэўнена. Недарма ў райёне толькі два калгасы, недарма затрымліваецца юрыдычнае афармленьне трох таварыстваў і аднаго калектыву. Людзі кладуць нязьмерную колькасьць энэргіі, каб упэўніць барадатых дзядзькоў арганізаваць камуну, а райвыканком саліна часыкойвае:—сьпяшацца няма чаго... Ісьці паступова, але надзейна...

...Машыністка выстукае за „Ундэрвуде“, пляны рассылаюцца па сельсаветах, а там, не прачытваючы, падшываюць да пажоўклых папак. Кожны працуе, нервуецца, арганізаваць каля пасяўную кампанію...

Цім. Зарэчны.

Савгасам попел не патрэбен...

У нас шмат пісалася, яшчэ больш гаварылася аб кампаніі па зьбіраньню попелу для скарыстаньня яго як угнаеньня на палёх. У гэтую вельмі важную кампанію мы стараемся ўцягнуць самыя шырокія колы насельніцтва.

Як сьведчыць абсьледваньне, менскія заводы і фабрыкі шчыра адгукнуліся на заклік дапамагчы сельскай гаспадарцы і попел зьбіраюць досыць акуратна.

Да фабрык і заводаў былі прыпадаваны тыя ці іншыя савгасы, якія навінны былі-б прыяжджаць і забіраць попел, але...

Лепш зьвернемся да фактаў.

Да заводу «Беларусь» быў прыпадоваи савгас Ст. і Новы Селец. На заводзе штодзень зьбіраецца больш 15 пуд. попелу. І вось савгасаўцы прыехалі і венк адзін раз, забралі попел, а потым, відаць, махнулі на гэтую справу рукой і...

За попелам на «Беларусь» штодзень прыходзіць неарганізаванае насельніцтва і забірае попел, бо з савгасу, як гэта гаворыцца, «ні слуху, ні духу»...

На заводзе «Варшавянка» сабралі попелу ўжо звыш 100 пуд.; ляжыць ён пад сьнегам і ўспамінае нядобрым словам працаўнікоў з савгасу „Саламаравча“.

На заводзе «Пралетары» попел зьбіраюць таксама акуратна, а савгас «Вішнёўка», відаць, забыў, што яму трэба паведаць гэты завод і забіраць попел, бо дагэтуль ніхто з савгасу яшчэ не прыяжджаў.

Менскі хлебазавод не адстае ад іншых заводаў гораду: штодзень там зьбіраецца попел і складваецца на двары. Зразумела, сьнег пакрывае гэты попел, і ў выпадку адлігі — спэцыялісты кажуць—замест попелу можа зрабіцца адна гразь.

Савгас «Тарасава» таксама не адстае ад сваіх таварышоў і ніводнага разу ніхто з савгасу на хлебазавод не заглянуў.

А вы кажаце, што нашы савгасы пікавяцца пытаньне узьнятьня ўраджайнасьці, што яны шпаркім тэмпам рыхтуюцца да вясеньняй пасяўнай кампаніі...

В. З—ў.

Як рыхтуюцца да сяўбы мэліарацыйныя т-вы.

У 1929 г. у БССР будзе арганізавана 100 новых мэліарацыйных т-ваў і маркуецца падняць да 7000 гакт. асушаных балот.

Зараз праводзіцца падрыхтоўка да апрацоўкі і засеву падняты балот. Ідзе загатоўка насеньня дугавых трэў: 600 пуд. насеньня будзе загатоўлена у межах СССР і каля 2000 пуд. мае быць завезена з па-за межаў. Вялікая ўвага зварачаецца на арганізацыю трактарных калён. Усяго будзе працаваць на асушаных балотах мэліарацыйных т-ваў 4 трактарныя калёны, па 5 трактараў у кожнай. Апроч гэтага, у мэліарацыйных т-вах будзе працаваць яшчэ каля 45 трактараў.

Для забясьпячэньня трактараў патрэбнымі прыладамі зроблены заказы у Чэхаславакіі і Нямеччыне. Частка балотных трактарных плугоў заказана на Брэнскім заводзе.

У галіне угнаеньня пакуль што справа абстаіць дрэнна. У БССР мае быць завезена 1500 тон калійнай солі, у той час, як толькі для адных мэліарацыйных т-ваў патрабуецца 2500 тон.

У зьвязку з гэтым паўстае неадкладная патрэба павялічэньня завозу калійнай солі. Апроч гэтага мэліарацыйным т-вам дадзена дырэктыва—усямерна выкарыстоўваць на угнаеньне мясцовы попел.

Адначасна з правядзеньнем залуженьня будзе праводзіцца арганізацыя штучных выганаў для жывёлы. Усяго сёлета кіруецца арганізаваць каля 350 гакт. штучных выпасаў.

НЯМА НАЛЕЖНАГА НАГЛЯДУ.

У Пухавіцкім раёне, Менскай акр. к-ты сялянскай узаемадапамогі амаль нічога ня робяць. Пяць нашых к-таў сялянскай узаемадапамогі да гэтага часу ледзь ачысьцілі 1256 пуд., што складае 8 проц. заданьня. Трэба было загатовіць 6000 пуд. насеньня, а загатовілі толькі 2.00 пуд.

Гэта сьведчыць аб тым, што ні Пухавіцкі РВК, ні райённы к-т сялянскай узаемадапамогі пакуль што не разварушыліся. Да справы зернаачышчэньня ніхто не падрыхтаваўся. Пакуль ня быў атрыман ліст абежнік т. Галадзеда, РВК не зварачаў жадной увагі на працу к-таў сялянскай узаемадапамогі.

Мы патрабуем рашучага перазому у працы к-таў сялянскай узаемадапамогі ў галіне зернаачышчэньня.

С. І Яз БАР

ЛІТАРАТУРНЫЯ НАТАТКІ.

„Полымя“ за 1928 г.

«Полымя», бязумоўна, зьяўляецца самай сталай беларускай часопісьсю літаратуры, палітыкі і эканомікі. Пачаўшы выходзіць у 1922 г. невялікімі сшыткамі, з пагам часу часопіс дайшла да значных памераў (да 18 аркушаў), пачала выдавацца і багацейшым па зьместу і прыгажэйшым па агульнаму выгляду. 1928 год у разьвіцьці часопісі займае асаблівае месца: у другой палове гэтага году часопіс з паўтарамесячнага зрабілася штотэсячнай, што таксама сьведчыць толькі аб яго росьце, аб вялікіх яго дасягненьнях; у 1928 г. замест звычайных васьмі нумароў „Полымя“ выйшла ў 10 нумарох, а 1929 год досыць ужо 12 нумароў.

Часопіс мае разьдзелы: настацкае літаратуры, грамадзка-публіцыстычны і эканамічны. Таму мы і спынімся на кожным з іх паасобку.

У «Полымі» суправодзіначаюць самыя лепшыя беларускія літаратурныя сілы. І зусім зразумела, што разьдзел настацкае літаратуры самы лепшы сярод іншых разьдзелаў. Але трэба адзначыць, што наадзіў, якія ўскладаліся чытачамі у гэтым годзе на літаратурны разьдзел, «Полымя» не апраўдала.

Чаго хоча зараз чытач і чаго ён у праве вымагаць ад сталае часопісі? Наш чытач вырас ужо настолькі, што ён чакае вялікіх настацкіх паланён, ён чакае вялікіх раманаў. Што гэта так, мы бачым з таго, што некаторыя раманы выходзяць ужо другім выданьнем («Сокі цаліны» Ц. Гартнага). А у «Полымі» за 1928 г. мы маем толькі адзін вялікі твор—раман Я. Нёманскага «Драпежнікі», які друкаваўся у 5 кніжках і нават ня скончан друкам. З гэтае прычыны даць сталы разгляд гэтага твору пакуль што немагчыма.

Другім буйным творам зьяўляецца аповесьць Я. Лінаноўскага—«Над абрывам». Аўтар дае малюнак грамадзянскае барацьбы. У часе змаганьня шмат каму прыходзілася рваць, пачынць асабістае ў ахвяру клясавану, перажываць вострыя моманты ўнутранае барацьбы. Усё гэта знайшло свой адгук у творы Лінаноўскага, прычым аўтар паказвае значны крок уперад на сваім творчым шляху, у параўнаньні з папярэднімі яго настацкімі творамі.

З больш дробных празаічных твораў трэба адзначыць апавяданьні М. Нікановіча («На хутары»), В. Каваля („Жыво“), А. Дудара, („Самагубца“ і «Вецер з усходу»). У Нікановіча захапляе чытача шчырасьць перажываньня героя, старога дзеда, які у сьвяты вызваленьня Беларусі ад белапалякаў не пашоў на працу, захапляе трагізм гэтых перажываньняў. Каваль даў вельмі прыгожы абразок з жыцьця вёскі, новае вёскі, якая ўжо пачынае зьяўляцца на загонах Беларусі. Як В. Каваль, так і М Нікановіч дауно ужо зарэкамандавалі сябе адзьнымі нападымі пісьменьнікамі. І гэтыя іх творы цалкам апраўдаюць тую надзею, якая ўскладаецца на іх, як на празаікаў.

А. Дудар зьмясьціў два апавяданьні. Абодвы яны закранаюць пар студэнцтва. У першым аўтар м[illegible] ў-бу, якое «адзін прыняцьне — беспрынцыповасьць», Малюецца жыцьцё асобы, якая ня мае зніякае мэты, якая хоча сканчыць жыцьцё самагубствам, але... „т[illegible]ія самагубствам не канчаюць“. Гэты чыталігэнцік настаўнік замест самагубства, канчае самабічным шчасьцем на-мяшчанску. Другі твор Дудара «Вецер з усходу». Што даў нам «Усход», які вецер дзьмуў нам адтуль? Вецер вызваленьня з-над ярма парыжу, з-над панскага ярма, вецер нацыянальнага і сацыяльна а вызваленьня. А. Дудар гэтага ня бачыць, Дудару вецер з усходу прыносіць дурман, п'яны угар, туман. У творы выводзіцца адмоўны тып студэнта, які прышоўшы з вескі, далучыўся да гарадзкое культуры на ўдароваму: п'янства, распуста і ўсё гэта адбываецца толькі тады, калі дзьне... вецер з усходу. Відаць, Дудар ня бачыць. Цімо ня хоча разумець палітычнага значэньня Усходу.

Зусім асобнае месца сярод празаічных твораў, зьмешчаных ня толькі ў Полымі за 1928 г., але і ў іншых беларускіх часопісах і зборніках, займае апавяданьне Цішкі Гартнага—«Гаспадар» (№ 1). Аўтар малюе рабочага Я. Гузіка, які прапрацаваўшы шмат год на заводзе, зразумеў, што гаспадары заводу самі рабочыя. Апісваюцца адносіны Я Гузіка да заводу і яго працы, і адносіны да Гузіка з боку адміністрацыі і з боку іншых рабочых, сярод якіх было шмат гультаёў, якія ўзьнялісь супроць таго, каб высоўвацца «гаспадара», як яны пазвалі Гузіка, на пасаду памесьніка дырэктара.

Беларуская літаратура дасюль яшчэ ня ведала такое тэмы, які. Яшчэ дасюль выдумоўваюць сюжэты, шукаюць тэмы, а ня бачаць, што жыцьцё само просіцца, каб яго пачыталі. Гартны першы зрабіў крок па гэтаму шляху і, трэба адзначыць, крок удалы. Апавяданьне захапляе чытача і [illegible]ецца з цікавасьцю з пачатку да канца.

З іншых твораў Ц. Гартнага зьмешчана «Рыгор у Нецярбурзе»—урывак з трэцяе часткі раману «Сокі цаліны» —«Крыжавыя дарогі» (№ 10).

Апрача вышэйпаданых, у Полымі зьмясьцілі свае апавяданьні наступныя т. т. Е Цаханові «Страх», Н. Вішнеўская «Завея» і В. Сташэўскі «Чорная ноч».

У 1928 г. «Полымя» распачало друкаваць літ. творы з жыцьця Зах. Беларусі. Дасюль аб ёй у нас амаль зусім не пісалася. У гэтым годзе зьмешчана тры апавяданьні аб Зах. Беларусі, усе тры Л. Радзевіча: «Рабочы Гамаш», «Нямая барацьба» «Нягодзе». Усе яны малююць жыцьцё у Зах. Беларусі, зьдзекі дэфэнзывы над працоўнымі і змаганьне працоўных за вызваленьне, за людзкое жыцьцё. Л. Радзевіч добра апісвае розныя здарэньні у працэсе змаганьня.

У гэтым годзе, чаго ня было ў «Полымі» у мінулыя некалькі год, выдрукавана п'еса М. Зарецкага «Віхор на балоце». Тэма п'есы—пытаньні быту, змаганьне старога з парасткамі новага. Гама вельмі злабадзённая, актуальная Трэба адзначыць, што закранутае пытаньне ня зусім распрацавана: віхру на мяшчанскім балоце, які-б расчысьціў сьмяцьцё і бруд, так і няма. Аўтар ня даў сапраўднага малюнку барацьбы, малюнку, які відзен бы быў з самага вынесту, а ня толькі са слоў адных дзейных асобы. Паасобныя малюнкі пададзены аўтарам досыць добра, добра абмаляваны і некаторыя асобы (Маркулавіч).

З вершаванага матар'ялу на першым месцы трэба паставіць паэму Якуба Коласа—«На шляхох волі». Праўда, друкуецца паэма паасобнымі ўрыўкамі, і канчаткова

Надыходзіць „Усесаюзны двухтыднёвік ашчаднасьці". Партыйныя, савецкія і прафесыянальныя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры да належнай падрыхтоўкі гэтай кампаніі.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ ПАЛАЖЭНЬНЯ ПРА БЕЛАРУСКУЮ ПАЛАТУ МЕРАК І ВАГАЎ.

Замест зацьверджанага ЦВК і СНК Палажэньня „Аб паверачных палатах мерак і вагаў у БССР" (З. З. БССР 1925 г., № 9, арт. 83) і пастановы ЦВК і СНК БССР «Аб ліквідацыі Беларускай Палаты Мерак і Вагаў» (З. З. 1927 г., № 33, арт. 170) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зацьверджаць наступнае

ПАЛАЖЭНЬНЕ

пра Беларускую Палату Мерак і Вагаў.

1. Беларуская Палата мерак і вагаў знаходзіцца пад загадваньнем ВСНГ БССР.

2. У кампетэнцыю Беларускай Палаты мерак і вагаў уваходзіць:

а) нагляд за правільнасьцю і аднастайнасьцю мерак, вагаў і ўсякіх вымерных прыладаў, якія ўжываюцца на тэрыторыі БССР;

б) нагляд за выбарам мерак і вагаў;

в) збіраньне і распрацоўка статыстычных зьвестак пра меркі, вагі і іншыя вымерныя прылады, якія ўжываюцца на тэрыторыі БССР.

3. Для ажыцьцяўленьня паказаных у артыкуле 2 задач Беларуская Палата мерак і вагаў мае права:

а) выдаваць на падставе законаў правілы і інструкцыі для ўжываньня мерак і вагаў;

б) рабіць першапачатковую і паўторную праверку мерак і вагаў і экспертызу вымерных прыладаў па прапанове дзяржаўных і грамадзкіх устаноў і прадпрыемстваў;

в) рэгіляваць па сваёй ініцыятыве меркі і вагі на ўсіх установах і прадпрыемствах, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР;

г) падрыхтоўваць пранаўікоў у галіне праверкі мерак і вагаў;

д) выдаваць дазволы на права вырабу і рамонту мерак і вагаў;

е) папярэджваць сярод насельніцтва веды пра меркі і вагі і пра спосабы іх ужываньня;

ж) выбіраць сумы за праверку і клеймаваньне мерак і вагаў і здаваць іх у касы НКФ БССР для залічэньня ў даход дзяржавы.

4. Беларуская Палата мерак і вагаў кіруецца ў паверачна-метралягічнай справе загадамі Галоўнай Палаты мерак і вагаў і мае апошні права ВСНГ БССР справаздачы пра сваю дзейнасьць.

5. Беларуская Палата мерак і вагаў мае права адчыняць часовыя альбо сталыя аддзяленьні.

6. Беларуская Палата мерак і вагаў мае сваю пячатку з дзяржаўным гэрбам і сваю назву і асобныя клеймы для клеймаваньня мерак і вагаў і вымерных прыладаў.

7. На чале Беларускай Палаты мерак і вагаў стаіць Кіраўнік, які назначаецца ВСНГ БССР.

8. Пад ведамам Беларускай Палаты мерак і вагаў знаходзяцца на гасподарчым разрахунку майстэрні для выраб[illegible] і рамонту вымерных прыладаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

26 студзеня 1929 году.
г. Менск.

Постановление Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

О БЕЛОРУССКОЙ ПАЛАТЕ МЕР И ВЕСОВ.

В отмену утвержденного ЦИК и СНК БССР Положения „О поверочных палатах мер и весов в БССР" (С. З. 1925 г., № 9, ст. 83) и постановления ЦИК и СНК БССР «О ликвидации Белорусской Палаты Мер и Весов» (С. З. 1927 г. № 33, ст. 170) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют утвердить следующее

ПОЛОЖЕНИЕ

о Белорусской Палате Мер и Весов.

1. Белорусская Палата мер и весов находится в ведении Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

2. В компетенцию Белорусской Палаты мер и весов входит:

а) наблюдение за правильностью и однородностью мер, весов и всех измерительных приборов, употребляемых на территории БССР;

б) наблюдение за выбором мер и весов;

в) собирание и разработка статистических данных о мерах, весах и других измерительных приборах, употребляемых на территории БССР.

3. Для проведения в жизнь указанных в статье 2 задач Белорусская Палата мер и весов имеет право:

а) издавать на основании законов правила и инструкции об употреблении мер и весов;

б) производить первоначальную и повторную проверку мер и весов и экспертизу измерительных приборов по предложению государственных и общественных учреждений и предприятий;

в) проверять по своей инициативе меры и веса во всех учреждениях и предприятиях, находящихся на территории БССР;

г) подготовлять работников в области проверки мер и весов;

д) выдавать разрешения на право изготовления и ремонта мер и весов;

е) распространять среди населения знания о мерах и весах и о способах их употребления;

ж) взыскивать плату за проверку и клеймение мер и весов и сдавать их в кассы НКФ БССР для зачисления в доход государства.

4. Белорусская Палата мер и весов руководствуется в проверочно-метрологическом деле распоряжениями Главной Палаты мер и весов и предоставляет последней через ВСНХ БССР отчеты о своей деятельности.

5. Белорусская Палата мер и весов имеет право открывать временные или постоянные отделения.

6. Белорусская Палата мер и весов имеет свою печать с государственным гербом и своим наименованием и особые клейма для клеймения мер и весов и измерительных приборов.

7. Во главе Белорусской Палаты мер и весов стоит Управляющий, назначаемый ВСНХ БССР.

8. В ведении Белорусской Палаты мер и весов находятся на хозяйственном расчете мастерские для выработки и ремонта измерительных приборов.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

26 января 1929 г.
г. Минск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ БУЙНЫХ САВЕЦКІХ ГАСПАДАРАК НА ЗЕМЛЯХ КАЛЁНІЗАЦЫЙНАГА ФОНДУ БССР.

Для найбольш мэтазгоднага і рэнтабельнага скарыстаньня мэліараваных балотных плошчаў, прызначаных для ўтварэньня калёнізацыйнага фонду БССР і вучасткаў мінеральнае глебы, якія прызначаюцца да іх, павялічэньня вытворчасьці і таварнасьці сельскае гаспадаркі, узмацненьня яе сацыялістычнага сэктару і стварэньня апорных пунктаў для культурна-тэхнічнага і эканамічнага абслугоўваньня гаспадарак насельніцтва, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Вылучыць з вызначаных у бліжэйшае 5 годзьдзя для перадачы ў сельска-гаспадарчае карыстаньне зямель калёнізацыйнага фонду запаведныя плошчы для арганізацыі буйных савецкіх гаспадарак.

Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства не пазьней 1-га сакавіка 1929 г. складзьці праекты арганізацыі новых савецкіх гаспадарак, вызначыўшы найбольшыя памеры і спецыяльны напрамак іх.

2. Асноўнымі задачамі новых савецкіх гаспадарак зьяўляюцца:

а) стварэньне базы для разьвіцьця таварных тэхнічных і збожжавых культур і прадуктаў жывёлагадоўлі з ужываньнем навуковых мётадаў арганізацыі буйнае гаспадаркі на мэліраваных землях і будаваньне ў іх тэхнічных прадпрыемстваў для перапрацоўкі сельска-гаспадарчага сыр'ю на тыпу сельска-гаспадарных камбінатаў;

б) дапамога інтэнсіфікацыі і індустрыялізацыі сельск. й гаспадаркі праз: 1) паляпшэньне сярод сялянства збожжавых культур, заводзкае жывёлы, гатункова насеньня і пасадачнага матэрыялу, 2) арганізацыю трактарных калён, злучных, пракатных, зернаачышчальных пунктаў і рамонтных майстэрняў, 3) перапрацоўку прадукцыі гаспадарак вазкольнага сялянства на тэхнічных прадпрыемствах і 4) вядзеньне працы для аб'яднаньня сельскага насельніцтва ў вытворчыя сельска-гаспадарчыя кааператывы.

3. Арганізацыю буйных савецкіх гаспадарак даручыць Беларускаму Сельска Гаспадарчаму Трасту, якому перадаваць запаведныя плошчы з калёнізацыйнага фонду пасьля падрыхтоўкі іх да сельска-гаспадарчага скарыстаньня. Гэтыя савецкія гаспадаркі знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку і, як прадпрыемствы рэспубліканскага значэньня, уваходзяць у склад Беларускага Сельска-Гаспадарчага Трасту.

4. Парадак фінансаваньня савецкіх гаспадарак, што арганізуюцца на землях калёнізацыйнага фонду, вызначаецца асобнымі законамі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

22 сьнежня 1928 г. г. Менск.

ПАПРАЎКА.

У Палажэньні аб Гарадзкіх Саветах, якое зацьверджана ЦВК і СНК БССР 22 сьнежня 1928 г., (апублікавана ў газэце «Савецкая Беларусь» за 1929 г.—№№ 15 і 17) у другім абзацы, арт. 69, пасьля слова „апалчэньня" дадаць памылкова прапушчаныя словы «гарадзкімі саветамі».

Сакратар ЦВК БССР А. Хацкевіч.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выдавецтва Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. «Каз»—Н. Плавільшчыкаў. Апавяданьне старога гуся. З расійскае мовы пераклаў А. Жк. Стар. 102, цана 35 кап.

2. «Зямля»—Кузьма Чорны. Раманы ў трох частках. Стар. 353, цана 1 р. 95 кап.

3. «У новай Каледоніі № 1.»—С. Майер. Стар. 263, цана 1 р. 25 к.

4. „Тыграва балота"—пад рэдакцыяй Ів. Цьвікевіча. Стар. 66, цана 25 кап.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ДВУХТЫДНЁВІКА АШЧАДНАСЬЦІ.

Пасяджэньне камісіі ЦВК БССР па правядзеньні 2-тыднёвіка ашчаднасьці.

5 лютага пад старшынствам т. ХАЦКЕВІЧА адбылося пасяджэньне камісіі прэзыдыуму ЦВК БССР па правядзеньні ў БССР 2-х тыднёвіка ашчаднасьці. Асноўная мэта кампаніі 2-х тыднёвіка выкачаць да 1 красавіка 1929 г. 75 проц. гадавога пляну па ўкладчыках і ўкладах. Адначасна з гэтым становіцца задача рашучага пералому ў разьвіцьці ашчаднай сп[illegible]ра на вёсцы.

Кампанію пастаноўлена правесьці ў перыяд між 15 лютага і 15 сакавіка.

Усім АВК і РВК запрапанавана неадкладна прыступіць да падрыхтоўкі кампаніі. Кіраўніцтву Беларускай акругі сувязі запрапанавана прыцягнуць увесь паштовы і электрафны апарат для правядзеньня гэтай кампаніі на вёсцы.

Апроч гэтага, пастаноўлена прасіць наркамасьветы і ЦСПСБ зьвярнуцца з лістом да ўсіх палітасьветных устаноў, настаўніцтва і прафарганізацыі аб актыўным удзеле ў гэтай кампаніі. Наркамфіну і рэспубліканскай касе ашчаднасьці запрапанавана прыняць меры да забясьпечаньня ўсіх акруг шывым інструктажам і мірваньнем.

Як Менская акруговая кантора сувязі „рыхтуецца" да двухтыднёвіка ашчаднасьці

Уся партыя, уся савецкая грамадзкасьць аддаюць зараз вельмі многа ўвагі ўзмацненьню ашчаднай справы. Аб гэтым яскрава гаворыць такі факт, як правядзеньне ва ўсесаюзным маштабе «двухтыднёвіка ашчаднасьці».

Зразумела, што ў першую чаргу, побач з шырокай дапамогай мясцовых органаў і грамадзкасьці, павінен належным чынам падрыхтавацца сам ашчадны апарат і разгарнуць самую актыўную працу.

Асаблівае значэньне пры гэтым мае праца паштовага апарату, бо паштовыя касы складаюць звыш 70 проц. агульнага ліку кас і зьяўляюцца асноўным зьвяном ашчаднага апарату на вёсцы.

Аб важнасьці «двухтыднёвіка ашчаднасьці» і прыняцьці самых рашучых мер да ўзмацненьня працы паштовых кас ёсьць, акрамя дырэктыў па лініі вышэйшых кіруючых органаў, катэгарычныя распараджэньні Народнага Камісара Пошт і Тэлеграфаў і Беларускае акругі сувязі.

Аб тым, як Менская акруговая П-Т кантора адносіцца да гэтых дырэктыў, сьведчыць наступны факт: атрымаўшы тэлеграму НКП і Т, і начальніка Беларускае акругі сувязі аб задачах двухтыднёвіка ашчаднасьці і падрыхтоўцы да яго правядзеньня, загадчык Менскай акруговай П-Т канторы тав. Тачко палажыў на іх рэзалюцыю: „У бухгальтарыю, для выкананьня".

Зразумела, што бухгальтарыя пошты, якая зьяўляецца чыста тэхнічным апаратам і мае дачыненьні толькі з разрахункамі, нічога ў галіне падрыхтоўкі гэтай важнай палітычнай кампаніі ня можа зрабіць.

Такія адносіны да кампаніі, ужо ў часе падрыхтоўкі яе, зразумела, зьяўляюцца недапушчальна нядбайнымі.

За такія фармальныя адносіны да гэткай важнай кампаніі трэба прыцягваць да адказнасьці, як за невыкананьне дырэктыў партыі і ўраду, а чым павінна памятаць Менская П-Т кантора.

Нядбайным адносінам да кампаніі не павінна быць месца.

Падольскі.

ХРОНІКА.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ АМНІСТЫІ ЮБІЛЕЙНАЙ СЭСІІ ЦВК БССР.

Нар. Кам. Унутраных Спраў БССР атрымаў першыя весткі з папраўчых дамоў некаторых акруг аб амнісьціраваньні зьняволеных, згодна пастановы юбілейнай сэсіі ЦВК БССР да 10 годзьдзя агалашэньня БССР. З полацкага папраўчага дому вызвалена 55 чал., з Бабруйскага—123 чал. і скарочан тэрмін зьняволеньня напалову—42 чал., па Аршанскаму вызвалена 160 чал. і па Слуцкаму—68 чал., а таксама скарочан тэрмін напалову 20 зьняволеным.

ВЫБАРЫ ГАРСАВЕТАЎ АДБЫЛІСЯ ПА 100 ВУЧАСТКАХ.

(Весткі даюцца цэнтр. выбарч. камісіяй на 6 лютага).

Выбары ахапілі 11 гарсаветаў. На гэтай тэрыторыі налічваецца 23900 выбаршчыкаў. Зьявілася ўсяго на выбары 16497 чалавек, альбо 69 проц., з іх жанчын 57,4 проц. У мінулыя выбары на сходах было ўсяго выбаршчыкаў 62,4 проц., а жанчын—50,9 проц.

Выбрана сяброў гарсаветаў 585 чал., з якіх 129 жанчын. З гэтай колькасьці 213 партыйцаў і камсамольцаў 44 чал. У параўнаньні з мінулымі выбарамі партыйна-камсамольская праслойка засталася амаль незьмененай (камсамольцаў павялічылася толькі на 3,2 проц.).

Па нацыянальнасьці абраныя падзяляюцца наступным чынам: беларусаў—60,3 проц.; яўрэяў—27,4 проц., расейцаў—6,7 проц., палякаў—4,1 пр. і іншых 1,5 пр.

ПАДРЫХТОЎКА НОВАГА КАЛЁНІЗАЦЫЙНАГА ФОНДУ.

Народны Камісарыят Земляробства БССР распрацоўвае праект падрыхтоўкі Брагінскага калёнізацыйнага фонду.

Гэты фонд ахопіцьме забалочаныя абшары Брагінскага, Камарыцкага і Хойніцкага раёнаў, Гомельскай акругі. Увесь плян калфонду дасягне 40.000 гэкт. Галоўнай працай зьвяцца тут падрыхтоўка ваданарыёнікаў рэчак нізінай Брагінкі і Мядзьведзіны.

Калфонд падрыхтоўваецца выключна пад арганізацыю калгасаў.

СУД.

БУХГАЛТАР ЗАЯЦ АПРАЎДАНЫ.

У газэце «Савецкая Беларусь» за сьнежань месяц 1928 г. быў надрукаваны судовы артыкул—«Касір і бухгальтар—растрачыкі». Па прыгавару Менскага акруговага суду касір гандлёва-будаўнічага трасту Іосель Каплан і галоўны бухгальтар Язэп Заяц сапраўды былі асуджаны за растрату 3000 р.—Каплан—на тры гады і Заяц—на чатыры гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і з спагнаньнем з Каплана 396 р. 88 к. і з Зайца—1267 р. 76 к. Па амністыі мера сацыяльнай абароны абодным была скарочана напалову.

Па касацыйнай скарзе Язэпа Зайца Вярхоўны суд рэспублікі знайшоў, што Язэп Заяц працаваў сумленна, што прыпісваная яму растрата ў сапраўднасьці была зроблена Капланам, які разам з сяброўкай Кауфманам на судзе і на папярэднім дазнаньні абгаварылі Зайца без усялякай падставы. Прыгавор Менскага акруговага суду адносна падсудзнага Язэпа Зайца Вярхоўны суд адмяніў, і Зайца ў суду апраўданы.

У прэзыдыуме Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

Сродкі на закупку вопраткі для дзіцячых дамоў.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія адпусьціла 6.000 руб. на палепшаньне становішча дзіцячых дамоў Менскай акругі. Сродкі пойдуць, галоўным чынам, на закупку вопраткі для выхаванцаў дзіцячых дамоў.

Арганізацыя с.-г. арцелі для бясспрытульных.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў арганізаваць у Менскай акрузе сельска-гаспадарчую арцель для бясспрытульных дзяцей. Пытаньне аб арганізацыі гэтай арцелі канкрэтна даручана высьветліць Менскай акруговай Інспэкцыі Парасьветы.

Упарадкаваньне бясспрытульных у санатарыях.

У апошнія часы назіраецца значны прыток бясспрытульных з вёскі, якія да гэтага часу працавалі ў якасьці пастухоў і батракоў.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі ўзьняў хадайніцтва перад Наркамсобесам аб прадаўжэньні пэўнай колькасьці месцаў у санатарыях для пасылкі іх туды на працу.

Абсталяваньне майстэрняў для бясспрытульных дзяцей.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія адпусьціла Менскаму тэхнікуму „Прахільнік дзяцей" 5.500 руб. на абсталяваньне барабэльнай і заняцкай бясспрытульнасьцю па Менскай акрузе. Сродкі пойдуць на абсталяваньне майстэрняў для бясспрытульных дзяцей.

У Беларускай Акадэміі Навук.

Праўда аб Літоўскай Мэтрыцы.

У бібліятэку БАН паступіла надзвычайна цікавая часопісь з эпохі Вялікага Княства Беларуска-Літоўскага, [illegible] яго новае асьвятленьне некаторым [illegible]ным падзеям.

Часопісь гэта была выдадзена ў Горадні ў 1792 г.—ад 9-га сьвежня за № 7. У гэтым нумары адзначаецца, што ў 1792 г. Мэтрыка Вялікага Княства Беларуска-Літоўскага і сам мэтрыкант (асоба, якая вяла запісы) знаходзіліся ў Вільні.

Такім чынам, зараз, на падставе гістарычных дакумэнтаў, устаноўлена, што Мэтрыка Вялікага Княства Беларуска-Літоўскага была вывезена ва Варшаву, як гэта сьцьвярджаюць польскія і некаторыя расейскія вучоныя, а ў Вільні.

Знойдзены рукапісы Дуніна-Марцінкевіча.

Катэдра літаратуры БАН набыла 2 вельмі цікавыя рукапісы, пісьменных твораў беларускага пісьменьніка Дуніна-Марцінкевіча.

Гэтыя рукапісы знайшоў на Гомельшчыне артыст БДТ І Флёрыян Жлаевіч; рукапісы вымяшчаюць у сабе паэмы, якія былі прызначаны для друку. Гэта відаць з таго, што на іх ёсьць заўвагі і памяткі цэнзара Кучальніка. Рукапісы ня былі апублікаваны таму, што ў 60 г. мінулага стагодзьдзя была выдана забарона друкаваць па-беларуску.

УПАРАДКАВАНЬНЕ МЯСТЭЧАК МЕНШЧЫНЫ.

Прэзыдыум Менскага Акрыканкому ўключыў мястэчкі Халопеічы, Зембін і Пагост у плян гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак 1928-29 г.

У Халопеічах будзе праведзена зеляніпарадкаваньне на плошчы ў 1008 гэкт. З лясного зямельнага фонду будзе перададзена 300 гэкт. зямлі, на якой будзе арганізавана 2 калгасы з 32 сем'яў. У галіне сматарнай кааперацыі будзе арганізавана некалькі вытворчых арцеляў, якія ахопяць 35 чал. Прадугледжана таксама набудаваць камбінат у складзе крахмальнага заводу, мыйну і электрастанцыі.

У м. Зембіне будзе арганізавана шэраг сматарных арцеляў, якія ахопяць 42 чал. На калёнізацыйным зямельным фондзе «Конаве» з 56 сем'яў будзе арганізавана 2 калгасы. Існуючыя калгасы таксама будуць пашыраны на 16 гаспадарак. Агульнае упарадкаваньне ахопіць 210 сем'яў, або 62 пр. насельніцтва мястэчка.

У м. Пагосьне, Бярэзінскага раёну, 12 сем'яў арганізоўваюцца ў калгас на плошчы ў 140 гэкт. Будзе ўзбудавана існуючая с.-гасп. арцель «Фрайгайт», якой адведзена ніва 100 гэкт. зямлі з запаснага фонду.

Курсы для перападрыхтоўкі спэцыялістаў прамысловасьці.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла арганізаваць 2-х месячныя курсы для паляпшэньня кваліфікацыі інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў прамысловасьці і выкладчыкаў прафтэхнічных навучальных устаноў. Курсы будуць арганізаваны пры Менскім Дзяржаўным Політэхнікуме. Мэтадному даручана распрацаваць і зацьвердзіць навучальны плян гэтых курсаў. Курсы разьлічаны на 50 чал. і ўтрыманьне іх будзе каштаваць 91.8 руб. Выдаткі на ўтрыманьне курсаў будуць пакрыты з фонду з прапаватных адлічэньняў прамысловасьці.

Экскурсія рабочых „Меншвэя" у Ленінград і Маскву.

Гэтымі днямі ў Ленінград і Маскву выязджае экскурсія рабочых „Меншвэя".

У Ленінградзе і Маскве рабочыя знаёмяцца з пастаноўкай працы на шэйных фабрыках.

Арганізацыя польскага вандроўнага тэатру.

Савнарком БССР зацьвердзіў арганізацыю польскага вандроўнага тэатру. На ўтрыманьне тэатру асигнавана ў бягучым гаспадарчым годзе 5.000 р. Ужо распачалося камплектаваньне тэатру.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня юбілею Чырв. арміі.

Фрунзаўскі райком камсамолу распачаў падрыхтоўку да сьвяткаваньня 11-й гадавіны Чырвонай арміі 17-га лютага наладжваецца дыжная вылазка камсамольцаў разам з чырвонаармейцамі №-скага палка. Апрача гэтага, ячэйкамі будуць наладжаны ваяводныя выхады ў поле.

23-га лютага ячэйкі наладжваюць разам з чырвонаармейцамі вечары, прысьвечаныя юбілею Чырвонай арміі.

Абсьледаваньне працы ТДА-Авіяхіму ў менскіх клюбах.

Менскі акруговы савет ТДА-Авіяхіму пачаў праводзіць абсьледаваньне пастаноўкі працы ДТА-Авіяхіму ў рабочых клюбах Менску. Абсьледаваньне павінна будзе вынікіць сувязь клюбаў з ячэйкамі ТДА-Авіяхіму, гурткамі вайсковых вёдаў і працу, якую пра ознаку клюбы ў справе ваенізацыі працоўных мас.

Выданьне усебеларускай студэнцкай часопісі.

Прэзыдыум ЦБ пралетстуду пастанавіў лічыць неабходным распачаць выданьне ўсебеларускай студэнцкай часопісі.

Часопісь асобных студэнцкіх арганізацый (БДУ) пастановлена зьліквідаваць.

Падрыхтоўка спэцыялістаў для прамысловасьці БССР.

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы было абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных працаўнікоў для нашай прамысловасьці і па лініі савецкага будаўніцтва.

Калегія лічыць неабходным для падрыхтоўкі спэцыялістаў з вышэйшай адукацыяй па грамадзянскаму і фабрычна-заводзкому будаўніцтву адчыніць вышэйшую тэхнічную навучальную ўстанову, для якой мяркуецца пабудаваць спэцыяльныя будынкі і набыць спэцыяльнае абсталяваньне да канца гэтай пяцёхгодкі з такім разрахункам, каб ВТНУ пачало функцыянаваць у пачатку наступнага пяцёхгодзьдзя. Пры ВТНУ мяркуецца адчыніць дарожнае аддзяленьне.

Забесьпячаньне прамысловасьці спэцыялістамі з вышэйшай адукацыяй—мэханікамі, электратэхнікамі, мэталюргамі, гарнякамі, інжынэрамі па радыё і тэлеграфу, спэцыялістамі па халадзільнай справе і па шэрагу іншых галін будзе праводзіцца шляхам кантрактацыі студэнтаў з ВНУ іншых саюзных рэспублік.

Выходзячы з заяўкі ВСНГ Бел. на інжынэраў-хімікаў прызнана неабходным з наступнага году адчыніць пры БДУ хімікатэхнічны факультэт. Падрыхтоўку для прамысловасьці эканамістаў, банкаўска фінансавых працаўнікоў, статыстыкаў і пляні оўтчыкаў будзе праводзіць Правгас БДУ. Для падрыхтоўкі эканамістаў мяркуецца адведна рэарганізаваць прамыслова-эканамічны цыкль Правгасу БДУ.

У працэсу бліжэйшых 5-х год будзе адчуваецца недахват у тэхніках-будаўніках. Для зьнішчэньня гэтага недахвату калегія Наркамасьветы прызнала неабходным з наступнага вучэбнага году павялічыць да 100 чал. прыём на будаўнічае аддзяленьне Менскага Дзяржаўнага Політэхнікуму. Пастаноўлена таксама ўзьняць пытаньне перад Савнаркомам БССР аб неабходнасьці пашырыць жылую плошчу Політэхнікуму шляхам пабудовы 3-га паверху і пабудовы новых корпусаў, без чаго немагчыма ня толькі адчыніць новыя аддзяленьні, але і пашырыць прыём. Пастаноўлена таксама штогод на дарожнае аддзяленьне Менскага Політэхнікуму прымаць да 100 асоб.

У сувязі з тым што штогодняя патрэба ў цёплатэхнікам сярэдняй кваліфікацыі складае ўсяго 11 чалавек, калегія НКА лічыць не мэтазгодным існаваньне цёплатэхнічнага аддзяленьня пры Віцебскім Дзяржаўным Політэхнікуме. Замест гэтага аддзяленьня вырашана адчыніць мэханічнае аддзяленьне на 70 чалавек з цёплатэхнічным ухілам. Існуючае цёплатэхнічнае аддзяленьне будзе рэарганізавана з разьлікам, каб студэнты першых 3-х курсаў сучаснага аддзяленьня на апошнім курсе атрымалі спэцыялізацыю ў галіне мэханікі.

Хімічнае аддзяленьне Віцебскага Політэхнікуму будзе рэарганізавана ў самастойны хімічны тэхнікум з пераводам яго ў Менск. У гэты тэхнікум будзе штогод прымацца 90 чалавек.

У галіне падрыхтоўкі мэналістаў з нізэйшай кваліфікацыяй вырашана арганізаваць спэцыяльную школу з 1-гадзічным курсам навучаньня для падрыхтоўкі трактарыстаў з штогоднім прыёмам 400 чал. У гэтую школу будуць прымацца галоўным чынам, сьлесары, якія скончылі курсы Цэнтральнага Інстытуту Працы. Калегія лічыць форму брыгаднага і асабліва індывідуальнага вучнёўства нездавальняючай і патрабуючай замены школамі фабрычна-заводзкага вучнёўства. Выказана пажаданьне, каб на тых прадпрыемствах, на якіх у брыгадах навучаецца ня менш 50 чал., арганізоўваць школы фабзавучаў.

Клюбная сцэна.

„ПЕРАД СЬВІТАНЬНЕМ".

(П'еса у 4 дзеях, 7 абразох М. А. Зорава).

(Клюб саўгандльслужачых).

„Клюбная сцэна зьяўляецца важнейшым фактарам нашага пачынага і культурнага выхаваньня мас". Так характарызавала партарада пры ЦК УсеКП(б) на пытаньнях тэатру нашы клюбныя сцэны. А між тым у нас амаль не адводзіцца ўвага вучоту вопыту важнейшай галіны клюбай працы. Нашы клюбы пасобку кожны сабе падбіраюць рэпэртуар сцэны і то часта выпадкова, што попадзецца пад руку. У выніку на нашы клюбныя сцэны вельмі часта пад дзе халтура і ўсялякая мяшчанска-надавальная дробязь. Праўда, у апошнія часы можна заўважыць некаторы пералом у бок якасьці работы. Ёсьць такія рэчы, якія моўчкі абсьцьці нема чма. Гэткаю зьяўляецца апошняя пастаноўка М. Зорава і Л. Ржацкай (артысты БДТ-1) у клюбе саўгандльслужачых п'есы М. А. Зорава «Перад сьвітаньнем».

П'еса знаёмдзіча асобнае гэрою барацьбы працоўных Беларусі супроць [illegible] балахоўскіх банд. На гэтым фоне [illegible] даволі шырокі матэрыял. [illegible] на шкадаў унутрэнні распад белаг[illegible] [illegible]чыны і стаўленьне прадпрыемства [illegible] асобных пластоў працоўных у бок разлагання (селянін). Але поруч з гэтым ёсьць і вялікі недахоп: аўтар, правозячы на працягу ўсёй п'есы роўнадзежасьці (у нас і ў іх), усё-ж ня зусім справіўся з тым, каб увязаць гэта ў адно. У выніку—адрыўчасьць, вуднаванасьць, а месцамі адступаньне ад станкага сьмітазу. Гэта вясткова тлумачыцца тым, што гэта першая праца М. Зорава, як драм турга. Апрач, як гаворыцца на гэта, п'еса мае поўнае права претэндаваць быць зачыненай у рэпэртуар нашых тэатраў. Гэта пальпіруюцца добрыя пасылкі, якія яна карыстацца і глядача клюбу саўгандльслужачых (стаўлялася 10 разоў). Гандаг забывае, што ён перад клюбнай сцэнай, а гэта ўжо зьяўляецца показальнікам, наколькі добрая ігра і наколькі яго захапляе пастаўленая п'еса.

В[illegible]ніх. Культурны рост і павышэньне сапатрабаў нашае ў сваёчным масштабе з боку працоўных мас выдатнурыўнае рост тэмадзейнага тэатру, які патрабуе да сябе большай увагі з боку савецкай грамадзкасьці.

Клюбу саўгандльслужачых не мешае б[illegible] паказаць гэту пастаноўку у парадку абмену другім саюзам.

Чар.—Б.

„Загадка млына".

(Кіно «Інтэрнацыянал»).

«Загадка млына»—камэдыя дзікае выторчасьці з удзелам Пат і Паташона. Пат і Паташон—сусьветна вядомыя комікі. Гераюць яны добра, але паштамзаваліся. Ва ўсіх камэдыях з іх удзелам, якія відомы менскаму гледачу Пат і Паташон выконваюць ролю безклапотных люмпэн-пралетараў. Яны ніколі не адлюцца суму, нават і ў нішчасьці. І вось у гэтым зьмяшчаецца буржуазна-клясавая сутнасьць камэдый з удзелам Пат і Паташона. Буржуазіі карысна падаваць такіх безклапотных люмпэн-пралетараў, каб гэтым зацямніць клясавую сьядомасьць прыгнечаных пралетарскіх мас у капіталістычных краёх. Ва ўсіх фільмах, дзе галоўныя гэрої—Пат і Паташон, яны нават намёку на клясавую барацьбу гэта старанна абходзіцца. Пат і Паташон—антымістычныя валацугі. Ва ўсіх фільмах з іх удзелам ёсьць адна характэрная рыса—гэта перапляценьне каждзіных момантаў, ніякавых і сьмешных надаежыньняў з сантыментальна-ліразмамі. Гэтае перапляценьне што-раз бывае шчасьце, але ўсё-ж Пат і Паташон застаюцца сабе сабрамі: тыж-ж рухі, той-ж выгляд, тая-ж міміка. Адным словам, на ўсёй іхняй ігры лёг штамп, моны, неверамоны. Вось гэты штамп без меры абяцяе вартасьці камэдый, якія ўсё-ж у іх ёсьць, ня гледзячы на іх сапраўдны напраўду. На пат-паташоўскі фільм із ёсьць, каб насьмяяцца і, сапраўды, часта сьмяешся, але пасьля фільму застаешся расчараваным. Пакуль прыёмы ігры Пат і Паташона знаёмы—камічнага шмат у фільме з іх удзелам. Прагледзішся, надакучае іх заўсёдышняя адноўласьць—на зьмену камічнаму выступае вялікая пустата гэтых фільмаў. Так і ў даным разе. „Загадка млына"—цалкам ненаўмыснае гэтае. Яна, хаця і мае чужы нам сацыяльны зьмест, бяспадзейна. Але другая бяда: надакучыла гэтыя пустыя фільмы. Час ужо перад вашымі кіно-арганізацыямі паставіць рубам задачу: «Даём савецкую камэдыю».

Габ.

Апавяшчэньні.

— У пятніцу, 8 лютага, а 9 гадзіне ўвечары ў ленінскім кабінеце камвузу адбудзецца пасяджэньне філёзофскай секцыі навуковага таварыства марксыстаў. На павестку дню — даклад тав. Усяпочкага «Эвалюцыя механічных погляду». Уваход вольны.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня лекцыя Бергмана—„Экскурсія па паўднёваму берагу Крыму". Пачатак а 8 гадз. увечары.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
ЧАЦЬВЕР, 7 ЛЮТАГА
Саюзу савгандльслужачых „СТРАЛОК ТЭЛЬ"
Пачатак а 8 гадз. увечары.

КІНО «КУЛЬТУРА». З АЎТОРКА „ПЕРШЫ КАРНЭТ СТРАШНЁЎ"

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». „ЗАГАДКА МЛЫНУ" в удзелам ПАТ і ПАТАШОН у 6 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ „ШЛЯХ ДА ЗДАРОЎЯ І КРАСЫ". Пачатак а 7 гадз. увечары.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). З АЎТОРКА „ТАНЬКА ШЫНКАРКА" у 6 частках.

У кантору газэты паступае шмат скаргаў ад падпішчыкаў НА КЕАТРЫМАНЬНЕ ІМІ ЛЁТАРЭЙНЫХ БІЛЕТАЎ. КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" АПАВЯШЧАЕ, што білеты ёю высылаліся толькі па прысылцы непасрэдна ў кантору квіткоў аб здачы падпіскі, аб чым і было абвешчана ў паведамленьнях аб лётарэі.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".
Пры неатрыманьні сьвечасова